ПРАЛЕСКА

Штомесячны навукова-метадычны ілюстраваны часопіс

№ 1 (233)

Студзень 2011

ВЫХОДЗІЦЬ СА ЖНІЎНЯ 1991 ГОДА

ЗАСНАВАЛЬНІК: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Часопіс перарэгістраваны ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне № 467 ад 8 чэрвеня 2009 года.

Галоўны рэдактар Алесь САЧАНКА

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:
Т.М. АРЭШКА, П.В. БЕСПАЛЬКО, І.У. ЖЫТКО, В.К. ЗУБОВІЧ, Т.М. КАРАСЦЯЛЁВА, Л.М. КЛЫШКО, Г.Р. МАКАРАНКАВА, Л.А. ПАНЬКО, Н.Ф. ПАШКАВЕЦ, М.М. ЧАРНЯЎСКІ, В.У. ЧЭЧАТ, С.А. ШТАБІНСКАЯ, В.А. ШЫШКІНА.

НАВУКОВЫЯ КАНСУЛЬТАНТЫ:
В.І. ІЎЧАНКАЎ, Я.Л. КАЛАМІНСКІ, І.А. КАМАРОВА, Л.А. КАНДЫБОВІЧ, Т.Ю. ЛАГВІНА, Л.Г. ТАРУСАВА, А.І. ЛЯЎКО, Н.С. СТАРЖЫНСКАЯ, І.І. ЦЫРКУН, В.У. ЧЭЧАТ.

КАНСУЛЬТАНТЫ ЧАСОПІСА:
Брэсцкая вобласць
Н.Д. ШАМОВІЧ.
Віцебская вобласць
А.В. ЛЯДВІНА.
Гомельская вобласць
Г.В. МЕЛЬНІКАВА.
Гродзенская вобласць
А.Л. КУХТА.
Магілёўская вобласць
Л.А. БАГНОЎСКАЯ.
Мінская вобласць
І.А. ІВАНОВА.
г.Мінск
Г.Ф. АСТРОЎСКАЯ.

Мастацкі рэдактар: М.А. АНЦІПКІНА
Літаратурны рэдактар: А.М. МАЛІНОЎСКАЯ
Мастацка-тэхнічная група: М.М. БУДЧАНІН, М.К. ПАНЧАНКА, В.І. САЧАНКА, Н.Я. ЧАРАТУН
Дзяжурны рэдактар: Л.М. КЛЫШКО

©«Пралеска», студзень, 2011.

Адрас рэдакцыі:
220103, г.Мінск, вул. Сядых, 42.
Тэл.: 8 017 281-20-65; 8 017 281-50-84; 8 017 281-26-62 (бухгалтэрыя).
E-mail: praleska-red@tut.by
Наш сайт: http://praleska-red.by

Падпісана да друку 03.01.2011.
Папера афсетная, на вокладцы і ўкладцы мелаваная.
Фармат 60х84 1/8. Ум. друк. арк. 8,5.
Ум. фарб.-адбіт. 11,3. Улік.-выд. арк. 11,35.
Тыраж па падпісцы 11.512.
Заказ 3283.
Надрукавана ў РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г.Мінск, праспект Незалежнасці, 79.

20

ШАНОЎНЫЯ КАЛЕГІ!

Шчыра віншуем Вас з Новым 2011-м годам! Жадаем моцнага здароўя, шчасця, плёну ў працы, поспехаў у вялікай і пачэснай, нашай агульнай справе — выхаванні дзяцей! Дзякуй за падпіску на «Пралеску»! Будзьма разам!

Калектыў рэдакцыі часопіса «Пралеска»

У НУМАРЫ

МІНІСТР АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ Сяргей Аляксандравіч МАСКЕВІЧ 2

ЛІСТ РЭДАКТАРА
А. Сачанка. ВІРТУАЛЬНАЕ — РЭАЛЬНАЕ! 3

У НАС — ТАК. А ЯК У ВАС?
Г. Лабанава. КРЫНІЧНАЙ ВАДОЙ БЕЛАРУСКІЯ СЛОВЫ БРУЯЦЬ. Шляхі і сродкі далучэння да беларускіх нацыянальных традыцый дзяцей дашкольнага ўзросту 4

МАЙСТАР-КЛАС
БЛАГОДАТНЫЙ СВЕТ ДУХОВНОГО ПРОСВЕЩЕНИЯ. Блок материалов по духовно-нравственному воспитанию дошкольников на православных традициях из опыта работы яслей-сада № 170 г.Гомеля 10

У МІНІСТЭРСТВЕ АДУКАЦЫІ
Н. Пашкавец. ВНУ: ВЫНІКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ЎСТУПНАЙ КАМПАНІІ 20

НАВУКОВЫЯ ПУБЛІКАЦЫІ
Л. Кандыбович. ПЕРИОДИЗАЦИЯ РАЗВИТИЯ ИСТОРИИ ПСИХОЛОГИИ В БЕЛАРУСИ. Жизнь и деятельность Л.С. Выготского 21

КАНФЕРЭНЦЫІ
А. Саченко. ПСИХОЛОГИЯ ДЕТСТВА В КОНТЕКСТЕ ВРЕМЕНИ 23

ДАШКОЛЬНАЯ ЎСТАНОВА — СЯМ'Я
Л. Клышко. РАБОТА З СЯМ'ЁЙ: ІНАВАЦЫЙНЫ ПАДЫХОД 25

АХОВА ПРАЦЫ
Инструкция по охране труда для кладовщика 27

ІНФАРМАЦЫЯ. ХРОНІКА
ПРАЦА ПА РАЗМЕРКАВАННІ І ЖЫЛЛЁВЫ ЎЛІК 29

ДЗЕ МАТЭМАТЫКА ЖЫВЕ?
Г. Бусовцова. МАТЕМАТИКА... В ДВИЖЕНИИ. Конспект комплексного развивающего занятия для детей группы «Фантазёры» с элементами физкультуры и математики 30
Е. Томашева. В ПОИСКАХ СОКРОВИЩ. Конспект математического конкурса для детей старшего дошкольного возраста 32

ВУЧОНЫЯ — ПРАКТЫКАМ
В. Іўчанкаў. БЕЛАРУСКАЯ МОВА: НОВАЯ РЭДАКЦЫЯ ПРАВАПІСУ. Заняткі 51—53 33

ЭТНАПЕДАГОГІКА
Н. Лях. «КАЦІЎСЯ КЛУБОЧАК...». Народныя гульні ў кантэксце заняткаў 37

КАРЭКЦЫЙНАЯ ПЕДАГОГІКА
Я. Шабала. ЗАИКАНИЕ: ИГРАЕМ, ПОЗНАЁМ ОКРУЖАЮЩИЙ МИР, ГОВОРИМ ПРАВИЛЬНО. Статья 4. Использование игровой деятельности в коррекции заикания у детей 42

МАЙСТАР-КЛАС
Л. Мындыкану, Е. Цупикова. МЫ ИГРАЕМ, МЫ РАСТЁМ! Сюжетно-игровые комплексы по сенсомоторному развитию детей раннего возраста (2—3 года) 47

ГУЛЬНЯ: ЖЫЦЦЁ І ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗІЦЯЦІ
И. Петрович. ШАХМАТЫ: ГИМНАСТИКА ПАМЯТИ, ВОЛИ, УМА 53

Я І СВЕТ ВАКОЛ МЯНЕ
М. Шавыркін. ПОРЫ ГОДА. ЗІМА 57

ПРАГРАМА «ПРАЛЕСКА»: ВЫЯЎЛЕНЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ
Ж. Мельникова. НА ДВОРЕ БЕЛЫМ-БЕЛО. Игра-занятие для детей группы «Малыши» 59
Е. Шичко. СНЕГ ПОРХАЕТ, КРУЖИТСЯ... Игра-занятие для детей группы «Малыши» 59
Н. Парамонова. СМЕШНЫЕ СНЕГОВИКИ. Игра-занятие для детей группы «Почемучки» (3—4 года) 60
Т. Сугако. НЕЗАКОНЧЕННАЯ СКАЗКА. Занятие для детей группы «Фантазёры» 61

ПРЭМ'ЕРА РУБРЫКІ
ДЕЛАЙТЕ С НАМИ, ДЕЛАЙТЕ САМИ! 62

ЮРЫДЫЧНЫ КЛУБ 64

На вокладцы часопіса: выхаванец ясляў-сада № 9 г.Мінска Арцём БЯЛОЎ, якому 1 студзеня 2011 года споўнілася 4 гады. Віншуем цябе, Арцём, шчасця і поспехаў табе ў жыцці!

Матэрыялы ў рэдакцыю павінны быць набраны на камп'ютары, рысункі, фотаздымкі разборліва падпісаны з адваротнага боку. Абавязкова неабходна дакладна і поўна паведамляць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, паштовы індэкс, хатні адрас, тэлефон, пасаду, пашпартныя дадзеныя стар. 31, 33 (серыя, нумар, калі і кім выдадзены, асабісты нумар грамадзяніна). Рукапісы па пошце не вяртаюцца.

У адпаведнасці са сваім Статутам рэдакцыя пакідае за сабой права на рэдагаванне, скарачэнне матэрыялаў, змену іх загалоўкаў і не вядзе перапіску з аўтарамі. Пункт погляду рэдакцыі не заўсёды супадае з пунктам погляду аўтараў. У адпаведнасці з Законам аб друку, за дакладнасць прыведзеных у публікацыях фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Тых, хто звяртаецца ў «Юрыдычны клуб», просім коратка і дакладна паведамляць сутнасць вашага пытання, свой адрас, тэлефон. Пераносы некаторых слоў зроблены паводле магчымасцей камп'ютара.

Матэрыялы, якія маюць рэкламны характар, пазначаны значком (Р). За змест рэкламы адказваюць рэкламадаўцы. Рэклама ў часопісе можа змяшчацца на замежнай мове. Цэны на рэкламу дагаворныя.

Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Аляксандравіч МАСКЕВІЧ

МАСКЕВІЧ Сяргей Аляксандравіч
Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь

Раней займаў пасаду старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і сувязях з СНД. Маскевіч Сяргей Аляксандравіч нарадзіўся 1 жніўня 1953 года ў в.Быкаўка Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя Я. Купалы, фізік. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар фізікі. Акадэмік Міжнароднай акадэміі адукацыі. Аўтар больш як 250 навуковых прац па фізіцы малекул і менеджменту ў адукацыі.

Працаваў лабарантам, старшым лабарантам, старшым інжынерам, старшым навуковым супрацоўнікам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, прарэктарам па навуковай рабоце і рэктарам Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Дэпутат Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў 23-га і 24-га скліканняў. Старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі дзяржаўнага грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства «Веды». Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

Навагодняе віншаванне педагагічнай грамадскасці Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргея Аляксандравіча Маскевіча

Паважаныя калегі!

Сардэчна віншую вас з Новым годам і Калядамі!

Сваёй дзейнасцю, грамадзянскай пазіцыяй вы даказалі, што наш гістарычны выбар — незалежная, моцная і квітнеючая Беларусь. Звяртаючыся да ўдзельнікаў навагодняга дабрачыннага свята ў рамках акцыі «Нашы дзеці», Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка заклікаў: «Любіце сваю краіну, сваю зямлю заўсёды, таму што на гэтай зямлі вам давядзецца будаваць свой дом, будаваць сваю краіну. Вы — наша будучыня. Я жадаю шчасця, працвітання, здароўя вам, вашым родным і блізкім, вашым педагогам, вашым бацькам. А яны сапраўды патрыёты нашай краіны, і яны гэта нядаўна даказалі».

2011 год адкрывае перад намі новыя перспектывы. Кожны з нас нясе асабістую адказнасць за навучанне і выхаванне духоўна багатай моладзі, прымушае думаць маштабна, адчуваць сябе дзяржаўным чалавекам, якому выпала пачэсная місія навучаць, выхоўваць, фарміраваць годнага сваёй Айчыны грамадзяніна.

Перакананы, што і ў Новым 2011-м годзе вы будзеце з годнасцю выконваць сваю настаўніцкую місію, знаходзіцца ў цэнтры грамадскага жыцця краіны, з'яўляцца актыўнымі прапагандыстамі ведаў, культуры і гуманітарных каштоўнасцей.

Дарагія сябры! Ад усёй душы жадаю вам моцнага здароўя, натхнення ў педагагічна-навуковай дзейнасці, асабістага шчасця, дабра і ўдачы!

З шанаваннем
Міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь
С.А. Маскевіч

Міністр адукацыі шчыра дзякуе

На адрас Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь С.А. Маскевіча прыходзяць віншавальныя лісты і паштоўкі з нагоды прызначэння на высокі дзяржаўны пост.

Сяргей Аляксандравіч шчыра дзякуе адказным асобам, калегам, сябрам за добрыя словы і пажаданні, выказвае ўпэўненасць у тым, што падтрымка, узаемапаразуменне калег і цеплыня сяброўскіх адносін дапамогуць яму ў вырашэнні надзённых праблем па развіцці і ўдасканаленні сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь.

ЛІСТ РЭДАКТАРА

ВІРТУАЛЬНАЕ — РЭАЛЬНАЕ!

Наступіў 2011-ты! Мы вітаем яго разам з Вамі, нашы шаноўныя чытачы. Найперш дзякуем, што зрабілі падпіску на «Пралеску», якой споўніцца сёлета ўжо 20 гадоў!

Час імклівы, няспынны і непаўторны, як і само дзяцінства, самі дзеці. Адпаведна — і ўмовы, мэты, методыкі іх выхавання і развіцця. Хто б сумняваўся, што сёння дашкольная адукацыя зойме вядучае месца ў чалавечым жыцці менавіта як адукацыя — істотная прыступка ў сістэме ведаў, як адметны рэсурс пераддашкольнай сістэматызацыі магчымасцей дзяцей. Між тым, практыка пераконвае: акадэмічныя дасягненні чалавека менавіта ў дашкольны перыяд проста каласальныя, а магчымасці ў развіцці асобы — выключныя! Невыпадкова ж паўстае пытанне аб пераносе шэрагу прадметаў на вывучэнне ў больш ранні ўзроставы перыяд з улікам узросту дзяцей і магчымасцей дашкольнай установы. І заўважце, што зусім нядаўняя замена вызначэнняў «дашкольнае выхаванне» на «дашкольная адукацыя» (паводле сусветнай практыкі) не выклікала нейкага асаблівага ўзрушэння ці трывогі ў бацькоў ды ў грамадстве! А гэта значыць, што наша праца, калегі, як ніколі раней, стала больш запатрабаванай і неабходнай, зразумела, яшчэ больш адказнай. Тут рэч і пра рэсурсы якаснай адукацыі, і пра дзяржаўную палітыку, аб чым было красамоўна засведчана на IV Усебеларускім народным сходзе: «Беларусь павінна выйсці ў лік першых 50 краін свету з найвышэйшым індэксам развіцця чалавечага патэнцыялу».

Вось чаму звыклае нашаму вуху разуменне фізічнага развіцця дзіцяці ўсё ж трэба разглядаць больш канкрэтна і дастасоўна, літаральна, поруч з інтэлектуальным. Гэта не аспрэчваецца нікім, а таму гаворка ідзе пра адаптаваныя педагагічныя тэхналогіі, магчымасці якіх у дашкольнай адукацыі па-сутнасці толькі-толькі пачынаюць асэнсоўвацца навукай і ўспрымацца практыкай. Для прыкладу назаву высокія (інфармацыйна-камунікатыўныя) тэхналогіі. Іх ролю, месца, мэты ў раннім развіцці і адукацыі дзіцяці сусветная супольнасць нарэшце стала асэнсоўваць. Куды ж дзенешся: усе мы карыстаемся — і ўсё больш прафесійна — электроннай поштай, інтэрнэтам, мабільнымі тэлефонамі, лічбавымі фотаапаратамі, відэакамерамі, шматлікай іншай электроннай тэхнікай. Ёсць ужо аднаасобны тэрмін — «дыгітальныя здольнасці дзіцёнка», які адлюстроўвае яго магчымасці і ўменні выкарыстоўваць лічбавыя сродкі (цифровые средства) для вырашэння розных задач або мэтаў. Тут, між іншым, узнікае і не адна праблема, прычым досыць актуальная: віртуальнасць і рэальнасць...

Так складана? Так проста? Не-не, вельмі і вельмі няпроста! Псіхолагі ўжо канстатуюць: парушаецца традыцыйнае разуменне дзяцінства (у сэнсе фізічнага засваення навакольнага асяроддзя) і фарміравання асобы чалавека. З імі пагадзімся. Аднак важна і тое, каб дзіцёнак дзейнічаў рэальна і рэальна асэнсоўваў усё, што адбываецца навокал яго, прычым у дыялектычным узаемадзеянні і ўзаемасувязі. Дакладна: фізічная і віртуальная рэальнасць істотна разняцца. Духоўнасць, асабовыя якасці, чалавечнасць застаюцца! Адсюль робім адпаведныя высновы...

Калегі, скажаце — Каляды, Новы год, а галоўны рэдактар такі сур'ёзны. Святы ёсць, дзякаваць Богу, і стануцца. Пасля наступаюць будні, праца, тое, што робіцца для нас, у імя нас, намі самімі. Вось да гэтага я Вас і заклікаю. І ў гэтай справе, як заўсёды, з Вамі будзе часопіс «Пралеска». Гэты нумар таму пацвярджэнне!

З Новым годам! Душэўнага камфорту, улюбёнасці ў жыццё, адчування рэальнасці, выдатных пачуццяў! Дзякуй Вам за творчае супрацоўніцтва, выключнасць асабістых зносін і высакароднасць. Няхай Вам заўжды свецяць радасцю дзіцячыя вочкі, адкрываюцца дабром і спагадай бацькі, а сэрца і душу поўняць Надзея, Вера, Любоў!

Будзьма разам, і тады мы — адбудземся!

МАЙСТАР-КЛАС

Галіна ЛАБАНАВА,
загадчык ясляў-сада «Сонейка»,
аграгарадок Кадзіна,
Магілёўскі раён

У Беларусі — ясныя вочы,
Многа любові ў грудзях:
Звонкае поле,
Звонкія сосны,
Звонкі і сонечны шлях.
У Беларусі кожны куточак,
Дзе ты не пойдзеш, пяе…
Звонкае слова,
Звонкая песня,
Звонкае сэрца яе.

Пятрусь БРОЎКА

Крынічнай вадой беларускія словы бруяць

ШЛЯХІ І СРОДКІ ДАЛУЧЭННЯ ДА БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЙ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

Лепей за ўсё
мне на свеце мясціны,
Дзе нарадзілася я і жыву.

Мілагучныя паэтычныя радкі, выпешчаныя ў душы Галіны Іванаўны, сталі запаветнымі. Яе працоўныя і сямейныя адносіны прасякнуты гэтым святым пачуццём.

Нарадзілася Галіна Жылікоўская (дзявочае прозвішча) 2 мая 1961 года на Астравеччыне. Тут, у вёсцы Грышконцы, і пачала спазнаваць хараство роднай зямлі. А потым, пражыўшы чатырнаццаць гадоў у Магілёве, куды пераехалі бацькі, вярнулася да вясковай прасторы. У 1979 годзе Галіна выйшла замуж за Аляксандра Лабанава, і ў наступным годзе маладая сям'я пасялілася ў Кадзіне. Непадалёку ад абласнога цэнтра шырока разгарнулася выхаваўчая і педагагічная дзейнасць творчай асобы.

Спачатку Галіна Іванаўна працавала выхавальнікам, потым — выхавальнікам-метадыстам, а з 1988 года ўзначальвае дашкольную ўстанову. Увесь час з неаслабнай увагаю яна вучыць дашкольнікаў гэтак, як і родных дзяцей Юрыя і Юлію, каб яны любілі Радзіму, бераглі нацыянальную спадчыну, ганарыліся сваім народам.

Далучэнне дзяцей да нацыянальнай культуры — асноўны абавязак выхаваўча-навучальных устаноў. Пытанні па гэтым аспекце дзейнасці ў нашых яслях-садзе выносяцца на абмеркаванне педагагічных саветаў. У гадавым плане ёсць пастаянная тэма «Азнаямленне дзяцей з нацыянальнай культурай». Для выхавальнікаў праводзяцца розныя формы метадычнай дапамогі: кансультацыі, семінары, якія дапамагаюць якасна выкарыстоўваць народныя святы і абрады ў выхаваўча-адукацыйным працэсе.

У нас зроблена наступнае:

- афармлена «Беларуская хатка»;
- зменены знешнія ўмовы ў групавым пакоі ў гэтак званы «беларускі дзень», які праходзіць у нас кожную пятніцу;
- у кожнай групе арганізаваны цэнтр літаратурна-мастацкай дзейнасці, дзе дзеці могуць пагартаць цікавыя кнігі;
- створаны ўмовы для правядзення літаратурных, дыдактычных, сюжэтна-ролевых гульняў «Бібліятэка», «Кніжная крама».

Адначасова фарміруецца яшчэ адзін вялікі кірунак працы — азнаямленне дзяцей з беларускай мовай і стварэнне беларускамоўнай атмасферы ў групах. Таму мы пастаянна шукаем розныя выхаваўчыя сродкі, каб актывізаваць дзейнасць у гэтым кірунку. Яго рэалізацыя адбываецца на фізічных занятках з выкарыстаннем беларускіх народных гульняў, на рухава-творчых занятках, заснаваных на адным з відаў вуснай народнай творчасці і беларускіх народных гульняў (лічылкі, забаўлянкі, пальчыкавыя гульні), на сюжэтна-фізічных занятках з элементамі фальклору, на музычна-рытмічных занятках і ў час правядзення народных святаў.

Кожны чалавек мусіць ведаць сваю родную мову і нацыянальныя песні, танцаваць свае народныя танцы, падтрымліваць святы і звычаі роднага краю, любіць свае родныя мясціны, сваю Радзіму — Беларусь.

Адзін з выхаваўчых сродкаў, які дазваляе актывізаваць нацыянальныя інтарэсы дзяцей і ўвесці іх у беларускамоўную стыхію, — народныя святы і абрады. Яны наладжваюцца з дзецьмі старэйшага дашкольнага ўзросту. Зразумела, не ўсе аспекты святаў і абрадаў беларускага народа даступныя ім, таму мы выбіраем тыя, у якіх дзеці могуць прыняць дасціпны ўдзел. Дарослыя выконваюць у народных святах і абрадах вядучую ролю, а малыя маюць магчымасць спяваць, скакаць, ладзіць гульні і інш.

Акрамя каляндарных святаў мы заўжды праводзім такія фальклорныя імпрэзы, як «Кірмаш», «Талака», на якіх дзеці знаёмяцца з побытам беларускага народа, яго майстэрствам, рамёствамі. У восеньскіх кірмашах асноўнае месца займаюць агародніна і садавіна. Адначасова праводзім выставу вырабаў з садавіны і гародніны, сухіх лісцеў і кветак. На зімовых кірмашах выстаўляюцца вырабы з тканіны, прыроднага матэрыялу і з цеста, вышыўка. Да ўдзелу ў выстаўках запрашаем педагогаў дзіцячага сада і бацькоў. Кожная група прадстаўляе свае вырабы, а кампетэнтная камісія падводзіць вынікі і абавязкова якім-небудзь падарункам адзначае лепшыя работы. А больш за ўсё дзецям падабаецца частаванне прысмакамі пасля заканчэння фальклорных святаў і кірмашоў.

Асаблівую ўвагу мы звяртаем на падрыхтоўчую работу. Каб дзеці не страцілі цікавасць да свята ў працэсе падрыхтоўкі да яго, дарослыя праводзяць свае рэпетыцыі асобна ад іх. На фізкультурных занятках знаёмім дзяцей з абрадавымі гульнямі; на музычных — завучваем абрадавыя песні, танцы;

на занятках па азнаямленні з наваколлем расказваем пра гісторыю і значэнне свята; па выяўленчым мастацтве — рыхтуем атрыбуты да свята.

Напярэдадні свята зала заўсёды прыбіраецца: вывешваюцца саматканыя посцілкі, ручнікі і вышыўкі, засцілаюцца абрусы, выстаўляюцца вырабы народна-прыкладнога мастацтва.

У нашых святах удзельнічаюць усе педагогі дзіцячага сада, абавязкова запрашаем да супрацоўніцтва бацькоў. Толькі тады, калі бацькі самі асэнсуюць выхаваўчае значэнне народных святаў і абрадаў, яны будуць больш спрыяць духоўнай сацыялізацыі дзяцей.

Азнаямленне дзяцей з гісторыка-этнаграфічнай спадчынай мы ажыццяўляем з дапамогай фальклорнага гуртка «Сонейка». На занятках і ў гутарках па азнаямленні з родным краем (рэкамі і азёрамі, раслінным і жывёльным светам) мы выкарыстоўваем дыдактычныя і народныя гульні, малыя формы дзіцячага фальклору, беларускія народныя казкі, апавяданні, вершы, загадкі і легенды, сцэнізуем казкі, наладжваем інсцэніроўкі, афармляем выставы па маляванні, аплікацыі, канструяванні з паперы, калажы, складаем мастацкія аповеды з асабістага вопыту і па малюнках.

Адначасова дзеці знаёмяцца з творчасцю беларускіх песняроў, з дзейнасцю ўсходнеславянскага першадрукара і асветніка Ф. Скарыны, з творамі беларускага фальклору: казкамі, вершамі, паданнямі, легендамі, прыказкамі і прымаўкамі, заклічкамі, калыханкамі, песнямі.

Паведамленні пра славутыя мясціны, гістарычныя гарады праводзім на занятках, у час гульняў-падарожжаў, малявання, чытання легенд і апавяданняў, спазнавальных гутарак.

Азнаямленне са старонкамі гісторыі ў выглядзе гутарак, гульняў дазваляе паказаць адметнасць беларускай зямлі, архітэктурны выгляд старажытных гарадоў, побыт гараджанаў мінулых стагоддзяў, растлумачыць, адкуль пайшлі беларусы і якія плямёны жылі раней, расказаць пра выхаванне дзяцей у мінулым. А легенды і паданні дапамагаюць высветліць сэнс назваў нашых гарадоў.

Немагчыма ўявіць сабе знаёмства з культурнай спадчынай Беларусі без заняткаў-падарожжаў па краіне беларускіх народных музычных інструментаў. На музычных занятках дзіцячы народны аркестр з задавальненнем іграе народныя мелодыі. А правядзенне фізічных культурных забаў на тэму «Як мы ведаем беларускія гульні» не толькі дапамагае пазнаёміць з народнымі гульнямі, але і дае магчымасць папрактыкавацца ў беларускай мове, бо вельмі часта ў гульнях выкарыстоўваюцца невялікія вершыкі, якія дзеці хутка завучваюць.

Але больш за ўсё нашым выхаванцам падабаецца беларуская народная творчасць. І ў гэтым дапамагае музей. Тут дзеці знаёмяцца з прадметамі побыту, адзеннем, вырабамі з саломы, лёну, гліны, дрэва, музычнымі прыладамі, дэкаратыўна-ўжытковым мастацтвам Беларусі (саломапляценнем, вышыўкай, ганчарствам, разьбой па дрэве), з традыцыямі беларускага народа. Вынікам такіх заняткаў становяцца дзіцячыя малюнкі, вырабы з гліны, пластыліну, паперы.

Вельмі значным момантам з'яўляецца запрашэнне ў госці да дзяцей народных умельцаў з вёскі Кадзіна, якія займаюцца ткацтвам, саломапляценнем, вышыўкай, пляценнем з лазы, разьбой па дрэве. Акрамя гэтага нашы выхавальнікі наведваюцца і ў школьны музей гісторыі і мастацтва Беларусі, а ўдзельнікі фальклорнага гуртка школы прыходзяць да нас з забавамі і вячоркамі.

У нас трывалыя ўзаемаадносіны: дзіцячы сад — школа — сям'я. Мы ствараем спрыяльныя ўмовы па пераемнасці дзейнасці дашкольнай установы ў пачатковай школе. Само тое, што і ў дзіцячым садзе, і ў школе дзейнічаюць фальклорныя гурткі, паказвае цесную сувязь у азнаямленні дзяцей з народнай спадчынай. Акрамя таго, гурткі школьнікаў, якія працуюць ад Цэнтра выхаваўчай работы аддзела адукацыі, дапамагаюць дзецям больш даведацца пра тканіну і саломку пры знаёмстве з адзеннем, пашытым з палатна рагожы і ўпрыгожаным узорамі з саломкі.

Яшчэ ў нас існуе ансамбль песні, у ім удзельнічаюць педагогі дзіцячага сада і школы.

Веды, якія дзеці атрымліваюць на занятках, замацоўваюцца ў самастойнай дзейнасці не толькі ў дзіцячай установе, а і дома. Таму асноўнай задачай у азнаямленні бацькоў з нацыянальнай культурай мы лічым фарміраванне актыўнай сацыяльнай пазіцыі бацькоў. Мы знаёмім іх з народнымі святамі, дэкаратыўна-ўжытковым мастацтвам, развіваем цікавасць да культурнай і гістарычнай спадчыны, народных традыцый. Звяртаем увагу на ролю прыроднага асяроддзя ў жыцці беларусаў, цесную сувязь чалавека і прыроды. З гэтай мэтай анкетуем бацькоў, праводзім кансультацыі, «круглыя сталы», гутаркі, сумесныя святы і абрады, з дапамогай бацькоў стварылі міні-музей, развучваем беларускія народныя песні, гульні, забаўлянкі, вывешваем беларускі слоўнік.

Выхавальнікі і бацькі павінны быць аднадумцамі ў авалодванні роднай мовай. Таму трэба далучаць бацькоў да правядзення ранішнікаў, забаў і інш.

У групавым пакоі на стэндзе мы змяшчаем творы беларускай дзіцячай літаратуры, якія варта прачытаць дзецям. У рубрыцы «Знаёмая незнаёмка» раскрываем значэнне асобных беларускіх слоў, прыводзім прыклады сінонімаў, даем беларускія варыянты распаўсюджаных рускіх прыказак.

Таксама прапануем бацькам купіць кнігу на беларускай мове. У сярэдняй і старэйшай групах увялі традыцыю — адзін дзень у тыдзень праводзіць гутарку «Мая любімая кніга», калі дзеці па чарзе прыносяць сваю любімую кніжку і расказваюць, як яе чыталі дома з бацькамі. Мы разумеем, што нацыянальная культура заўжды застаецца духоўнай скарбонкай. Этнакультура нашага народа мае свой унікальны пласт матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. Яна ўтрымлівае магутны выхаваўчы патэнцыял для развіцця і фарміравання паўнавартаснай асобы. Таму праца педагогаў у гэтым кірунку патрабуе пастаяннага пошуку новых спосабаў і магчымасцей уключэння розных элементаў этнакультуры ў духоўны свет маленькага чалавека, каб выхаваць яго асобаю.

Агульныя мэты яднаюць калектыў, робяць яго трывалым, творчым. У нас шмат дасведчаных і спрактыкаваных спецыялістаў. Ганарымся працаю Ірыны Лядзяевай. Як музычны кіраўнік вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі яна ўвесь час знаёміць дзяцей з нацыянальнымі традыцыямі. Гэтак дбайна адносіцца да сваёй і нашай агульнай справы Валянціна Кавалёва, выхавальнік вышэйшай катэгорыі з 30-гадовым стажам. Цёплую атмасферу ў калектыве ствараюць выхавальнікі Тацяна Бельчанка, Вольга Дыбаль, Зоя Варапай, Вольга Бушлякова, Алена Чарнякова. Заўсёды весела і цікава на фізічных занятках, якія наладжвае Ала Нямыцька. Традыцыі дашкольных устаноў і нашага калектыву беражліва падтрымліваюцца.

Прапануем вашай увазе некалькі заняткаў і святаў, якія мы выкарыстоўваем у сваёй дзейнасці па стварэнні беларускамоўнага асяроддзя ў дашкольнай установе і далучэнні да яго дзяцей і бацькоў.

Гуканне вясны

КАНСПЕКТ ФАЛЬКЛОРНАГА СВЯТА Ў ГРУПЕ «ФАНТАЗЁРЫ»

Праграмны змест: фарміраваць цікавасць да беларускай мовы, жаданне авалодваць ёю; садзейнічаць асваенню дзяцей новымі ведамі пры ўдзеле ў фальклорным свяце «Гуканне вясны»; выклікаць у дзяцей эмацыянальны водгук і пачуццё радасці і гонару за родны кут.

На пляцоўку выходзяць дзеці і дарослыя (выхавальнікі). Яны ідуць павольным крокам з вяснянкай «Вясна, вясна на калочку...». Накіроўваюцца да дрэва і, спяваючы, упрыгожваюць яго вянкамі, кветкамі, стужкамі.

1-я дзяўчынка *(звяртаецца да дарослых з паклонам).* Ці дазволіце, добрыя людзі, вясну клікаць, зіму праважаць, лета дажыдаць?

Старэйшыя даюць дазвол. Распальваецца «агонь».

2-я дзяўчынка *(кажа замову да сонца).* Красна сонца, ясен свет, і з лунамі яснымі, і з звёздамі частымі, і з вясеннім цяплом, і з летнім агнём, і ўгрэй, упар зямлю, разгусці зялёную траву!

3-я дзяўчынка.
Вылеці, пчолачка ярая,
Вынесі залатыя ключыкі,
Замкні халодную зіманьку,
Адамкні цёплае лецечка!

Дарослыя і дзеці збіраюцца ў карагод, каля дрэва выводзяць магічныя кругі пад песню **«Ты, пчолачка ярая...».**

Па чарзе ўсе ўдзельнікі кажуць словы:

1-я дзяўчынка.
Блаславі, Божа,
Вясну-красну пеці,
На ціхае лета,
На буйнае жыта.

2-я дзяўчынка.
Каб наша жыта
У трубы павілося,
У трубы павілося,
Набок схілілася.

Дарослыя.
На полі снапамі,
А ў гумне* тарпамі*,
На таку умалотна,
У арудзе* прысыпна,
А у млыне прымольна.
А у дзяжы падходна,
А у пячы пячыста,
А на стале краіста.

* **гумно** — вялікая халодная будыніна для складання і абмалоту зжатага жыта.

* **тарпа** і **торп** — вялікая сцірта снапоў, складзеных для захоўвання.

Група дзяцей і дарослых спявае песню **«Зіма з летам страчаецца».** У гэты час на пляцоўку выходзяць дзве дзяўчыны, якія ўвасабляюць Вясну (у прыгожай сукенцы) і Зіму (у лахманах). Яны вітаюцца.

Зіма. Ой, чалом, чалом, ды цёплая Вясна!

Вясна. Ой, здарова была, ды халодная Зімачка.

Зіма.
Што цябе, Вясна, узвелічаюць,
Мяне, Зімачку, праклінаюць?

Вясна.
Бо ты, Зімачка, халодная,
Лугі, балоты памарозіла,
Ой, я, Вясна, ды вясёлая,
Лугі, горы узвесяліла,
Лугі, горы ізмачыла.

Зіма, павярнуўшыся вакол сябе, уцякае. Да Вясны падбягаюць дзяўчаткі і пытаюць:

— А ты, Вясна, а ты, красна,
Што ты нам прынясла?

Вясна.
А прынясла я вам
Цёплую вясну ціхую,
І цёплую вадзіцу,
З зямлі травіцу.

Да Вясны падбягаюць хлопчыкі і пытаюцца:

— А ты, Вясна, ты, красна,
Што ты нам прынясла?

Вясна.
Пастушкам па кіёчку,
А дзевачкам па вяночку.

Вясна вымае з рэшата вяночкі і ўскладае іх на галовы дзяўчаткам. Усе спяваюць песню **«А ў лесе, лесе...».**

Гучыць музыка да карагода **«Танок»,** на яе фоне дарослыя кажуць:

Чый там карагод ходзіць,
Семсот да малайцоў водзіць?
Мікалайчыкаў карагод ходзіць,
Семсот ды людзей водзіць.

Усе ўдзельнікі свята водзяць карагод **«Танок».**

Здалёку, з другога боку пляцоўкі, з'яўляюцца валачобнікі і вясёлым гуртам ідуць у цэнтр пляцоўкі. Яны спяваюць, граюць, б'юць у бубен, свішчуць у дудкі, падыходзяць да дзяцей і дарослых.

1-шы валачобнік.
Ой, барамі сасновымі,
Ой, палямі жытнёвымі.

2-гі валачобнік.
Ідуць, гудуць валачобнікі,
Гукаючы, спяваючы...

3-ці валачобнік.
Валачобнікі валачыліся,
Валачыліся, намачыліся.

4-ты валачобнік.
А за чый жа двор зачапіліся?

Усе разам. Ды за ваш двор зачапіліся.

Валачобнікі граюць, танцуюць, пасля гэтага іх адорваюць яйкамі, печывам. Усё гэта кладзецца ў торбачкі валачобнікам, тыя ў адказ дораць гаспадарам папяровых і саламяных птушак.

Дзяўчаткі падкідваюць іх угару.

Затым валачобнікі прапануюць пахадзіць па хатах і сказаць гаспадарам добрую навіну, што вясна ўжо заклікана. Усе ўдзельнікі свята ідуць да будынка дзіцячага сада і гукаюць:

— Ой, ці дома пані гаспадыня?

На парог выходзіць гаспадыня.

Гаспадыня. Дома, дома!

Валачобнікі.
Спадарыня, спадарыня,
Кідай сваю пражу,
Зіма ужо прагнана,
Адчыняй свае дзверы
Ды кліч нас у госці!

Гаспадыня.
Заходзьце, добрыя людзі!
Дзякуй за добрую навіну!

1-шы валачобнік. Валачобнікі — не дакучнікі.

2-гі валачобнік. Не часта ходзяць, не дакучаюць.

3-ці валачобнік. У гэты гадочак — адзін разочак!

Усе разам.
Частуй нас, гаспадыня, за тое,
Што вясну паклікалі.

Гаспадыня. Каб пачаставаць, трэба спачатку заспяваць, павесяліць нас, бо без падпалу і дровы не гараць!

Валачобнікі спяваюць прыпеўкі, граюць, скачуць. Усе весяляцца. Гаспадыня частуе гасцей птушачкамі з цеста.

1-шы валачобнік. Дзякуй, гаспадыні, за пачастунак, пойдзем далей, панясем добрую навіну іншым людзям!

2-гі валачобнік.
Жадаем, каб дзяды не ведалі бяды,
А унукі не бачылі мукі.

3-ці валачобнік.
Каб былі здаровы, як дуб скарбовы!

Валачобнікі ідуць далей, дзеці і дарослыя гуляюць у даганялкі, гушкаюцца на арэлях.

Дабравесце, ці Звеставанне

КАНСПЕКТ ЗАНЯТКАЎ У ГРУПЕ «ФАНТАЗЁРЫ»

Праграмны змест: пазнаёміць дзяцей з народным святам – святам «Дабравесце», ці «Звеставанне»; праз фальклорную дзейнасць выхоўваць павагу і цікавасць да нацыянальных традыцый, садзейнічаць развіццю правільнага беларускага вымаўлення.

Ход заняткаў

Выхавальнік. Дзеці, вы звярнулі ўвагу на птушку, якая да нас прыляцела? Ёсць такая народная прыказка: «Бусел прыляцеў — вясна будзе». *(Дзеці паўтараюць.)* Ёсць яшчэ шмат народных прыкмет, дзе гаворыцца пра бусла: «Калі бусел прыляцеў крыху раней, то ў гэтым годзе вырасце выдатны лён». Як вы думаеце, які ў гэтым годзе будзе лён? *(Выдатны.)* А чаму? *(Бо буслы ўжо прыляцелі.)*

Паслухайце яшчэ народныя прыкметы: «Калі пчала не выходзіць з вулля да Дабравесця, то будзе добрае ўраджайнае лета, а калі пакажацца раней, то дрэннае, скуднае». Дзеці, а з вас хто-небудзь бачыў ужо пчалу? Калі не бачылі, то будзе ў нас добрае, ураджайнае лета. Але ж адной з самых дакладных прыкмет набліжэння вясны лічыцца прылёт бусла, які, па павер'і беларуса, заўсёды бывае на Дабравесце. «Вясна ўжо будзе», — гаворыць беларус, заўважыўшы першае з'яўленне гэтай птушкі.

Дзіця. Рады бусел клакоча
На гняздзе на ўвесь гай.
Радасць выказаць хоча,
Прыляцеў я ў свой край.
Тут над рэчкай сасёнкі,
Морам жыта шуміць,
Без любімай старонкі
Мне ніколі не жыць.

(А. Дзеружынскі)

Бабуля. Бусел — любімая птушка беларуса, бо ён прыносіць добрыя весткі. Людзі лічаць, што на чыім двары паселіцца бусел, там будзе поўны дастатак. Таму многія беларусы нацягваюць на стрэхі сваіх будынкаў ці на дрэўвы, што растуць у двары, старыя колы, каб яны паслужылі асновай для гнязда бусла. Разбурыць буслінае гняздо — вялікі грэх. Акрамя таго, па павер'і, у бусла ў адной назе знаходзіцца агонь, а ў другой — вада. Так што ён за разбурэнне гнязда ў адплату можа зрабіць пажар. Забіць бусла — таксама вялікі грэх. Гэта тое самае, што і забіць чалавека, бо лічаць, што бусел узнік з чалавека.

Дабравесце як час перавагі вясны над зімою прымушае падумаць і пра агароды. Як толькі павее вясновым цяплом, душа селяніна страпянецца, і ён з нецярпеннем чакае таго часу, калі прыйдзецца яму ўзяцца за святую справу апрацоўкі зямлі. Лічылася, што да Дабравесця нельга чапаць Зямлю-маці, бо яна можа прагневацца. Пасля Дабравесця, калі ўжо сыдзе снег, лепей за ўсяго ў чацвер сярод дня, зрабіць першую баразну. Гаспадар надзявае чыстую бялізну, кладзе ў торбу хлеб, соль, яйкі, сыр і ідзе ў поле. Там ён праводзіць толькі тры баразны (болей нельга!). Потым дастае яду з торбы, трохі падсілкоўваецца, па кавалку хлеба дае коням, а яйка закапвае ў зямлю. Гэта ён так частуе Зямлю-маці, каб яна была ласкавая і добра ўрадзіла, каб усюды было поўна, як тое яйка.

Я прапаную пагуляць у гульні **«Лянок»** і **«А мы проса сеялі»,** каб у гэтым годзе ўрадзіўся добры ураджай.

Да наступных заняткаў пацікаўцеся ў бацькоў, якія яны ведаюць загадкі, прыказкі і прымаўкі пра пары года, птушак і звяроў Беларусі.

«Кірмаш»

КАНСПЕКТ КАМБІНАВАНЫХ ЗАНЯТКАЎ У ГРУПЕ «ЧАМУЧКІ-II»

Праграмны змест: выхоўваць у дзяцей гонар за свой народ і край; узбагачаць мову дашкольнікаў лексікай з беларускага фальклору, развіваць жаданне авалодаць ёю; садзейнічаць паглыбленню цікавасці да прадметнай лепкі; выхоўваць творчыя здольнасці.

Ход заняткаў

Чуецца песня Дзеда-барадзеда (верш А. Вольскага, музыка Л. Захлеўнага).

Хто я? Дзед-барадзед.
Абышоў цэлы свет.
А цяпер у вясёлы час
Завітаў да вас.

Дзед-барадзед. Добры дзень, хлопчыкі і дзяўчынкі. Я прыйшоў здалёк. Дзеці, я ведаю, што вам дужа падабаюцца цацкі. А вы ведаеце, дзе можна іх купіць? *(Адказы дзяцей.)* Я быў на кірмашы, а там такія прыгожыя цацкі прадаюцца! Хадзем усе разам на кірмаш, можа, і вам гэтыя цацкі спадабаюцца.

Ідуць у музычную залу, інтэр'ер якой афармлены пад кірмаш. Гучыць беларуская музыка, на прылаўках шмат цацак. Дзяўчынка Паўлінка ў беларускім адзенні дзівіцца імі. Вітаюцца.

Дзед-барадзед. Шмат тут розных цацак, але мы купім тую, пра якую я вам загадаю загадку.

Чуецца музыка, мелодыя якой нагадвае спеў птушкі. Дзед-барадзед звяртае на гэта ўвагу і пытаецца, пра каго гучыць музыка.

Дзед-барадзед. Вось мы зараз яе і купім. *(Дзеці купляюць птушку-свістульку.)* Падабаецца вам птушка? Якая яна? *(Адказы дзяцей.)*

Дзед-барадзед прапаноўвае пасвістаць хлопчыку або дзяўчынцы. Дзеці дзякуюць і ідуць далей.

Дзед-барадзед чытае лічылку пра зайца. Пытаецца, пра каго яна? Прапануе пашукаць такую цацку на прылаўках. *(Дзеці знаходзяць зайку, купляюць.)* Зноў пытаецца:

— Чым вам падабаецца гэта цацка?

— Як майстар перадаў вобраз зайкі? *(Адказы дзяцей. Ідуць далей.)*

Дзед-барадзед. На кірмашы, дзеці, не толькі гандлююць, але і спяваюць. *(Прапаноўвае спець папеўку пра певунка. Дзеці купляюць певунка.)*

Дзед-барадзед. Чым прывабіў вас пеўнік? Як майстар перадаў убранне пеўніка? *(Адказы дзяцей.)*

Дзед-барадзед *(абагульняе расповед пра цацку).* Мы з вамі купілі беларускія народныя цацкі. Іх зрабілі майстры з гліны і па-свойму ўпрыгожылі. Гэтыя цацкі вельмі любяць дзеці, бо яны не проста цацкі, а яшчэ і свістулькі. *(Дзед-барадзед раздае іх, дзеці свішчуць.)*

Весялей, сябры, іграйце
І ляноту праганяйце!

Чуецца песня «Перапёлачка», якую выконваюць дарослыя. Дзеці вядуць карагод.

Дзед-барадзед.

Тук, тук, чаравік, не ляніся.
Туды-сюды, чаравік, павярніся.

Дзеці выконваюць танец **«Юрачка»** або **«Грабельчык».**

Пасля гэтага Дзед-барадзед прапаноўвае кожнаму выляпіць цацку, якая асабліва спадабалася. Сочыць, каб дзеці ўпрыгожвалі фігуркі не толькі з дапамогай стэкі, а і налепамі, валікамі, кольцамі і г.д.

Дзед-барадзед і дзеці ў канцы заняткаў разглядваюць усе цацкі, абмяркоўваюць іх, выбіраюць лепшыя, параўноўваюць з тымі, што набылі на кірмашы. Цацкі ставяцца на прылавак.

Пасля гутаркі дзеці развітваюцца з Дзедам-барадзедам.

Як ты сэрцу майму міла

КАНСПЕКТ КОМПЛЕКСНЫХ ЗАНЯТКАЎ

Праграмны змест: далучаць дзяцей да культуры беларускага народа, паглыбляць пачуццё любові і прывязанасці да роднага краю, да духоўных каштоўнасцей яго народа; удакладніць назвы вырабаў з гліны, прапагандаваць лепшы народны вопыт выхавання праз фальклор.

Ход заняткаў

Гучыць беларуская народная песня **«Наш край беларускі».** Дзеці апрануты ў беларускія нацыянальныя строі.

Выхавальнік (В.). Дзеці, сёння ў нас цудоўны дзень! А ці звярнулі вы ўвагу на тое, якая музыка цяпер гучала? *(Беларуская, пра наш родны беларускі край.)*

Дзеці, я ўпэўнены, што ўсе вы вельмі любіце сваю родную Беларусь, сваю краіну, у якой нарадзіліся. А вершы пра Беларусь ведаеце?

В. Давайце раскажам верш **«Дарагая Беларусь»** Петруся Броўкі.

1-е дзіця.
Залацістыя прасторы,
Незлічона ясных зор,
Рэкі ціхія, азёры,
Галасісты шумны бор!
Ты нас ласкай атуліла,
І я у шчасці гавару,
Як ты сэрцу майму міла,
Дарагая Беларусь!

В. Вось які цудоўны верш! Можа, хтонебудзь яшчэ ўспомніў?

2-е дзіця.
Беларуская краіна,
Перазвон азёраў, бароў.
Над палеткамі бульбы і жыта
Песня велічных курганоў.
Гэта наша зямля дарагая,
Гэта нашы лугі і палі,
Над якімі спрадвеку гукае
Бусел — сімвал бяссмерця зямлі.

В. Памятаеце, дзеткі, мы вучылі верш Веры Вярбы **«Мой край»?**

Мы любім свой край, сваю зямлю: вербы, бярозы, рэкі, крыніцы, сцежкі і пралескі. *(Дзеці называюць рэкі Беларусі, расказваюць гэты верш.)*

3-е дзіця.
Ад ветру гнуцца вербы лозы,
Бяжыць дарога напрасткі,
Мой край — бялюткія бярозы
Абапал сіняе ракі.
Высока ў небе вырай кружыць:
Ляціць за сіні небакрай.
Не забывай ніколі, дружа,
Сваю зямлю, свой родны край.
Мой край — лугі і пералескі,
Крыніцы звон і шум лясны,
Мой край — блакітныя пралескі
На сцежках ранняе вясны.

В. Мы любім птушак, якія ляцяць на зіму ў вырай, а пасля зноў прылятаюць, не забываюць свой край. Раскажыце, калі ласка, верш «Журавель» Веры Вярбы.

4-е дзіця.
Аблятаў журавель
Мораў сто і сто зямель,
Аблятаў, абхадзіў,
Свае крылы натрудзіў.
Мы спыталі ў жураўля:
— Дзе найлепшая зямля?
Журавель — нам у адказ:
— Няма лепшай, чым у нас!

В. Дзеці, а на якой мове мы з вамі размаўляем? І якая наша родная мова? *(Беларуская, прыгожая, ласкавая, пяшчотная.)*

Беларуская мова — гэта мова нашых бабуль, матуль, гэта цудоўная мова. А што вы, дзеці, ведаеце пра нашу мову, якія вершы мы з вамі вучылі?

Паслухайце верш **«Вечна жывая» Паўла Марціновіча.**

5-е дзіця.
Крынічкай спявае, не замярзае,
Родная мова.
У сэрцы не гасне,
поўніцца шчасцем,
Родная мова.
Над светам лунае, вечна жывая,
Родная мова.
І нас беларусаў збірае, яднае,
Родная мова.

Дзеці чытаюць верш Уладзіміра Скарынкіна **«Родная мова»**:

У шуме лясным словы
вечныя нашы гучаць,
Крынічнай вадой
беларускія словы звіняць,
Таму нашы продкі
любілі іх і бераглі,
Як пушчы і рэкі, азёры, гаі і палі.

В. Мы з вамі нарадзіліся і жывём у Беларусі, хто мы? *(Беларусы.)*

(Дзеці чытаюць вершы пра беларусаў.)

В. Дзеці, а што гэта ў вас за адзенне такое прыгожае? У што вы апрануты? *(У беларускае нацыянальнае адзенне.)* Ой, якія ж вы прыгожыя беларусы і беларусачкі! Вам не церпіцца расказаць пра сваё прыгожае адзенне? *(Расказы дзяцей.)*

Ну, а цяпер такіх прыгажунь-дзяўчынак і прыгажуноў-хлапчукоў я запрашаю на беларускі танец **«Зайграй жа мне, дударочку».**

(Выконваецца танец.)

В. Цудоўна павесяліліся. А цяпер вось што хачу прапанаваць. Памятаеце, дзеткі, я расказвала вам пра дзеда Васіля і бабулю Васіліну? Дык вось у нядзелю я ездзіла да іх у госці. Яны цікавіліся, ці вялікія вы ўжо сталі, і запрашалі ўсіх у госці. Таму я і прапаную вам такім прыгожым паехаць да іх у вёску. А паедзем мы не на машыне, не на аўтобусе, а на конях. Конікі ў нас незвычайныя. Мы выберам двух конікаў пры дапамозе лічылкі. Сядайце ў вазок і паехалі ў госці ў вёску.

(Дзеці становяцца парамі за «конікамі» і, падскокваючы, рухаюцца па кругу са словамі.)

Дзеці. Дожджык, дожджык, не ідзі,
Мы паедзем на кані,
На кіях драўляных,
З вербаў наламаных.
Дожджык, дожджык, не ідзі,
Мы паедзем на кані.
Едзем мы без шапак,
Не баімся крапак.

В. Ну вось, мы і ў вёсцы. Крыху адпачніце, а я пагляджу, ці каля той хаты мы спыніліся. *(Разглядае вакол сябе.)* О, дык тут жывуць дзед і баба. Дзень добры вам у хату!

Выходзяць дзед і баба.

Дзед і баба. Добры дзень, дзеці дарагія, унучкі і ўнучыкі. Заходзьце, калі ласка, да нас. *(На століку або на паліцы стаяць вырабы з гліны, на другім — куфэрак з ільнянымі вырабамі.)*

В. Дзеці, паглядзіце, колькі ўсяго цікавага ў дзядулі з бабуляй! Хата незвычайная, бо тут знаходзяцца незвычайныя рэчы. Увесь гэты посуд, што вы бачыце, дзед Міхась вырабляў сам у сваёй майстэрні.

Дзед. Так, так, даражэнькія. А ці ведаеце вы, з якога матэрыялу зроблены гэты посуд? *(З гліны.)*

Для працы я адбіраю самую лепшую гліну, замочваю яе, потым скачваю, адпрацоўваю на спецыяльным прыстасаванні і раблю вось такія прыгожыя і патрэбныя рэчы *(расказвае пра гліняныя рэчы).*

В. Дзякуй, дзядуля, вельмі шмат мы даведаліся цікавага. Ой, а што ж гэта такое тут стаіць? *(Куфэрак.)* У ім таксама шмат цікавага. Вось паглядзіце. *(Дастае рэчы і паказвае, з чаго яны зроблены.)*

Баба. Гэта ўсё я выткала сама.

В. Дзякуй, бабуля, вельмі цудоўна!

Дзеці, дзядуля і бабуля шмат працуюць. Для гэтага трэба рана ўставаць, старанна выконваць сваю працу, быць цярплівым, і толькі тады будуць атрымлівацца такія прыгожыя рэчы. *(Прапануе дзецям з бабуляй і дзедам пагуляць у гульню* **«Лянок».***)*

Дзед. Вось каб працаваць так хацелася, як гуляць і скакаць!

В. Кожнаму з вас бабуля падрыхтавала розныя рэчы, але не ўпрыгожыла іх. На гэтых рэчах трэба намаляваць беларускія ўзоры. А хлопчыкі ў нас будуць майстрамі-ганчарамі, пакажуць дзеду, што яны ўмеюць вырабляць.

(Дзеці працуюць пад гукі беларускай музыкі. Бабуля і дзядуля хваляць іх за стараннасць і частуюць.)

В. Дзякуй вам, дзед і баба, за ўсё! Нам час ужо вяртацца ў дзіцячы сад.

(Дзеці садзяцца ў вазок, вяртаюцца ў дзіцячы сад.)

Інструмент народны, і вясёлы, і журботны

КАНСПЕКТ ЗАНЯТКАЎ-ПАДАРОЖЖА Ў ГРУПЕ «ФАНТАЗЁРЫ»

Праграмны змест: прадаўжаць развіваць у дзяцей цікавасць да музычнай дзейнасці; даць дзецям веды пра беларускія музычныя інструменты (дудка, скрыпка, гармонік, цымбалы) і іх выразныя магчымасці; фарміраваць эстэтычны густ.

Ход заняткаў

Музычны кіраўнік (М.к.). Дзень добры, дарагія сябры! Сёння мы з вамі трапім у краіну беларускіх музычных інструментаў. А дапаможа нам Дзед-Усёвед. *(Гучыць народная мелодыя, з'яўляецца Дзед-Усёвед.)*

Дзед-Усёвед. Добры дзень, дзеці! Я, Дзед-Усёвед. Ці ведаеце вы, чаму ў мяне такое прозвішча? А яно такое таму, што я ўсё ведаю, на ўсе пытанні магу даць адказ.

Дзед-Усёвед.

Я, Дзед-Усёвед, абышоў цэлы свет,
Вяртаўся да дому,
нёс гасцінец малому.
На парозе сянец
свой паставіў карабец.
Калі ласка, усе, хто хоча,
адмыкайце замок.
Хто хутчэй адмыкне,
хай шапне на вушка мне,
Што у тым карабцы.
Адгадайце загадку:
Дзесяць дзірачак у ёй,
А ў кожнай голас свой. Што гэта? *(Дудка.)*

(Музычны кіраўнік адчыняе карабец, дастае дудку.)

Дзед-Усёвед. Дудка — гэта любімы музычны інструмент пастухоў. Праводзячы доўгі час на пашы, яны рабілі дудкі з дрэў, каб склікаць авечак. На дудках выконваюцца абрадавыя песні, якія ў пашавы сезон спявалі ў вёсках паўсюдна.

(Дзеці слухаюць песню **«Іграў я на дудцы».)**

Дзед-Усёвед *(загадвае загадку).*

Не жанчына, а спявае
Так, што сляза ў вачах гуляе,
А сыпне польку-трапятуху,
Не ўседзім, брат, не хопіць духу?
(Скрыпка.)

Дзед-Усёвед. Скрыпка прыйшла да нас з захаду. На Беларусі людзі вельмі любілі і любяць скрыпку.

Скрыпка пявучая ёсць у мяне *(паказвае скрыпку),*

Нясе таямніцы ў кожнай струне.

Гэта праўда, кожная струна пасвойму плача, спявае. *(Кранае кожную струну скрыпкі.)* Дзеці, а колькі струн мае скрыпка? *(Адказ: чатыры.)* Давайце зараз паслухаем, як гучыць скрыпачка. (*У грамзапісе гучыць музычны твор у выкананні скрыпача.)*

Дзед-Усёвед. А вось яшчэ адзін цікавы беларускі інструмент. *(Паказвае цымбалы.)* Хто ведае яго назву?

Гэта — інструмент народны,
І вясёлы, і журботны...
Вось дзе цуд, дзе прыгажосць!
Струн у ім мо з сотню ёсць,
Ключ для струн, два малаточкі,
Іх завуць яшчэ кручочкі...
Лёгкі ўзмах умелых рук –
І паплыў чароўны гук.
Малаточкі заскакалі,
а цымбалы заспявалі...
Струны срэбрам звіняць.
З чым іх спеў параўнаць?

На Беларусі яны з'явіліся даўно, іх вельмі любіць наш народ. На іх выконваюць музычныя творы — народныя песні, танцы, класічную музыку. Давайце паслухаем у выкананні цымбалістаў беларускую народную мелодыю **«Крыжачок».**

М.к.

Без музыкі, без дуды
Ходзяць ножкі не туды,
А як дудку пачуюць,
Самі ножкі танцуюць.

Дзед-Усёвед. Вось яна — мая дуда. *(Дастае з карабца малюнак дуды.)* Дудой у Беларусі называюць валынку. Гэта — адзін са старажытных музычных інструментаў. Гэта мех, зроблены са скуры казла, з некалькімі драўлянымі рознымі трубкамі. У час ігры дудар націскваў локцем на мех, паветра паступала ў трубкі. На дудзе падыгрывалі на вяселлях, ігрышчах, кірмашах, паказах батлейкі.

М.к. Дзед-Усёвед, хутчэй зайграй, хай пачуе ўвесь наш край.

(Выконваецца беларуская песня-танец **«Зайграй жа, дударочку»** *пад акампанемент гармоніка.)*

М.к. Дзеці, мы спявалі, танцавалі пад гучанне гармоніка. Так прыгожа было яго слухаць. А хто з вас ведае гісторыю яго паходжання?

Дзед-Усёвед. Ён прыйшоў на Беларусь з Расіі. У беларускай вёсцы пад гукі гармоніка весяліцца моладзь.

Сучасны гармонік мае сваю доўгую гісторыю развіцця. Спачатку з'явіўся губны гармонік *(паказвае яго),* які хутка распаўсюджваўся па ўсіх краінах. Гэта быў дзіцячы інструмент. З цягам часу беларускія майстры пачалі рабіць ручныя гармонікі. На гармоніку іграюць пераважна танцавальныя мелодыі, прыпеўкі. На вяселлі гармонік іграе разам з бубнам, барабанам, са скрыпкай і цымбалами *(уключае магнітафон).* Паслухайце, калі ласка, мелодыю.

М.к. Са старажытных часоў да нас дайшло шмат цікавых музычных інструментаў. Раней усе цацкі дзецям рабілі самі бацькі. Вырабляліся яны з дрэва, саломы, лёну, гліны, цеста. Каб дзецям было цікава, напаўнялі іх гукамі, а знешні выгляд адпавядаў птушцы ці іншай жывёле.

Дзед-Усёвед. Здагадайцеся, пра які музычны інструмент ідзе размова.

З гліны мы яго ляпілі,
Потым у печы абпалілі,
Навучыўся ён спяваць,
Не дае нікому спаць.
Хто гэта? *(Пеўнік.)*

(Дастае з карабца свістулку-пеўніка.)

Свістулька — духавы музычны інструмент. Полая сярэдзіна, яна, як і дудка, мае свістковае прыстасаванне — горлачка і некалькі ігравых адтулін, дзве ці болей. Вырабляліся свістулькі з гліны, абпальваліся разам з ганчарным посудам або ў звычайнай хатняй печы. Яны прыгожа глядзеліся, нагадвалі то нейкую птушку, то іншую жывёлу, то казачную істоту — лесавічка, чорціка, птушкі.

Дзіця.

Глінянага пеўніка мне падарылі,
Гліняныя ў пеўніка ножкі і крылы.
Хвост пер'ем гарыць,
і грабеньчык іскрыцца,
І свецяцца вочы, нібыта суніцы.
Ён самы прыгожы
з глінянай сямейкі.
Ну, пеўнік, як пеўнік,
ды дзіўны ён нейкі.
Пяюць галасістыя пеўні ў дварышчы,
А мой не спявае, а мой толькі свішча.

(Дзед-Усёвед раздае дзецям падарункі — гліняныя свістулькі.)

БЛАГОДАТНЫЙ СВЕТ ДУХОВНОГО ПРОСВЕЩЕНИЯ

Духовно-нравственное воспитание дошкольников на православных традициях. Из опыта работы учреждения образования «Ясли-сад № 170 «Теремок» ОАО «Ратон» г.Гомеля

(Окончание. Начало в № 12 за 2010 год.)

МАЙСТАР-КЛАС

Валентина РЕБЕНОК,
воспитатель

В минуту жизни трудную
Теснится ль в сердце грусть,
Одну молитву чудную
Твержу я наизусть.
Есть сила благодатная
В созвучье слов живых,
И дышит непонятная,
Святая прелесть в них.
С души, как бремя, скатится,
Сомненье далеко —
И верится, и плачется,
И так легко, легко...

Михаил ЛЕРМОНТОВ

Цикл занятий по православному воспитанию для детей группы «Фантазёры»

ЗАНЯТИЕ 1. «КАК БОГ ДАЛ ЛЮДЯМ ЗАКОН – ЗАПОВЕДИ БОЖЬИ»

Обучающие задачи: обобщить ранее полученные знания о жизни святого пророка Моисея; рассказать детям, как Господь Бог дал людям закон; познакомить с заповедями Божьими как основой жизни каждого христианина; учить жить по заповедям Божьим; помочь осознать всемогущество Бога — Творца, Учителя.

Развивающие задачи: развивать память, воображение, речь детей.

Воспитательные задачи: воспитывать у детей любовь к Богу и ближнему; формировать основы самооценки и самосознания в соответствии с основополагающими нравственными нормами.

Словарная работа: благословение, земля обетованная, закон, заповеди.

Материал: икона Спасителя, иллюстрации из книги «Библия для детей в картинках и рассказах», картинки-раскраски; аудиозапись колокольного звона, иллюстрации, отражающие различные поступки людей, карта-схема путешествия Моисея из Египта в Ханаан.

Предварительная работа: прослушивание аудиозаписи колокольного звона, чтение Библии, рисование библейских сюжетов.

Используемые методы и приёмы: наглядные (показ карты-схемы, Библии, иконы Спасителя, рассматривание детских рисунков, выбор иллюстраций по условию); словесные (художественное слово, повторение, объяснение, рассказ воспитателя, вопросы, комментирование, поощрение); игровые (игры-хороводы); практические (организация выставки, составление книги добрых дел).

Ход занятия

(Звучит аудиозапись колокольного звона. Дети, взявшись за руки, подходят к иконе Спасителя. Аудиозапись выключается.)

Воспитатель (В.). Дорогие ребята, давайте задумаемся над вопросом: что мы должны сделать перед началом любого дела? *(Ответы детей.)* Конечно же, мы должны попросить у Бога благословения, т.е. Божьей помощи во всяком добром деле. Давайте вместе попросим Божьего благословения. *(«Господи, благослови».)*

На прошлом занятии мы совершали путешествие вот по этому пути. *(Показывает карту-путь святого пророка Моисея из Египта в землю Ханаанскую.)* Вспомнили? Подойдите, пожалуйста, ещё раз посмотрите. Что вы здесь видите? *(Ответы детей.)*

Не пераносяцца на наступны радок знакі прыпынку.

Не пераносіцца на наступны радок злучок (дэфіс), які супадае са знакам пераносу (пры гэтым знак пераносу не ставіцца).

Пры пераносе **нельга адрываць** ад лічбы скарочаныя назвы адзінак вымярэння: *1990 г., XXI ст., 100 кг, 50 га, 2 км, 10 см, 1000 руб.*

Пералічаныя вышэй патрабаванні не заўсёды можна выканаць пры камп'ютарным наборы. У некаторых выпадках перавод радка ці разрыў трэба прадухіліць. У такім разе прымяняецца функцыя непарыўнага прабелу, якая можа пазначацца спалучэннямі клавіш Ctrl + Shift + прабел.

КНІГАЗБОР

«Беларускі правапіс у апорных схемах»

У мінулым годзе ў выдавецтве «Пачатковая школа» ўбачыла свет навучальнае выданне «Беларускі правапіс у апорных схемах»*. Ён складзены паводле новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» Віктарам Іванавічам Іўчанкавым. Беларускі правапіс тут пададзены ў выглядзе апорных схем, што спрыяе больш лёгкаму запамінанню матэрыялу. Схемы, зазначу, пабудаваны ў адпаведнасці з унесенымі зменамі ў «Правілы» 1959 года. Правілы выкладзены пакрокава ў выглядзе фігур, злучаных паміж сабой стрэлкамі. Палажэнні ў правілах беларускага правапісу і тое, што патрабуе ўвагі, вылучаецца асаблівай фігурай і пазначаецца клічнікам.

Выданне разлічана на шырокае кола чытачоў. Жывое, наглядное, зручнае для карыстання — адным словам, проста неабходнае тым, хто неабыякава ставіцца да роднай мовы.

Алена МАЛІНОЎСКАЯ

* **Іўчанкаў, В.І.** Беларускі правапіс у апорных схемах: паводле новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі / В.І. Іўчанкаў. — Мінск: Пачатковая школа, 2010. — 56 с.

Наталля ЛЯХ,
кіраўнік фізічнага выхавання вышэйшай катэгорыі,
ДУ № 11 г.Вілейкі

«Каціўся клубочак...»

НАРОДНЫЯ ГУЛЬНІ Ў КАНТЭКСЦЕ ЗАНЯТКАЎ

Паважаныя чытачы! Вашай увазе прапануюцца апісанні заняткаў па азнаямленні дзяцей з беларускімі народнымі гульнямі, праведзеныя ў гуртку па этнапедагогіцы «Іванка і Надзейка». Картатэку беларускіх народных гульняў і, у прыватнасці апісанне згаданых у гэтым матэрыяле гульняў, глядзіце ў папярэдняй публікацыі аўтара «Мы пачнём гульню шпарчэй!» у № 9 за 2010 год.

«НА СУСЕДНІМ ДВАРЫ»

Спартыўна-тэатралізаваныя заняткі

Узрост: «Чамучкі» (старэйшыя).

Задачы: пазнаёміць дзяцей з беларускай народнай гульнёй «Лавіць куры» праз тэатральную дзейнасць; развіваць гутарковую мову, памяць; удасканальваць навыкі бегу з лоўляй і ўхіленнем; развіваць спрыт, вынослівасць, настойлівасць; выхоўваць уважлівасць, назіральнасць.

Матэрыял: касцюмы куранятаў, пеўніка.

Ход заняткаў

Дзеці ўваходзяць у залу і бачаць, што трапілі на нечый дворык. Ён адгароджаны штыкетнікам, па зялёнай траўцы (па зялёным дыване) гуляюць куранятаў з пеўнікам (гэта старэйшыя дзеці, якія апрануты ў касцюмы куранятаў).

Вядучы. Які сёння цудоўны дзень! Радасна зіхаціць сонейка, прыемна спяваюць птушкі. А на нашым казачным двары гуляюць вясёлыя куранятаў. Паглядзіце, дзеці, як паважна каля куранятаў ходзіць пеўнік, даглядае іх. *(Дзеці разглядаюць птушак.)*

Перад дзецьмі адбываецца дзеянне, якое апісваецца ў гульні **«ЛАВІЦЬ КУРЫ».** Такім чынам яны маюць магчымасць паглядзець тэатралізаванае дзеянне і пазнаёміцца з новай беларускай гульнёй.

Пасля таго як старэйшыя дзеці пагуляюць 2—3 разы ў гульню, певень збіраецца ісці на суседні двор.

Певень *(падыходзіць да дзяцей этнагрупы).* Добры дзень, суседзі! Як ваша здароўе, як адпачываецца? *(Дзеці адказваюць.)*

Я хачу запрасіць вас да сябе ў госці, у мяне вельмі цікава, весела ў двары. Але вас так шмат, што мне патрэбен будзе памочнік, давайце мы яго знойдзем па лічылцы:

Бегла курка па таку,
Па зялёным табаку,
Ела цукар і мядок.
Адыдзі ў іншы бок.

Вядучы. Зараз мы з маім сябрам Пеўнікам завядзём вас, куранятаў, на суседні двор, дзе вы пазнаёміцеся з маімі куранятамі.

Старэйшыя дзеці-куранятаў вітаюцца з малодшымі, гавораць на мове пеўнікаў, размахваюць крыламі, запрашаюць гуляць.

Адзін раз старэйшыя і малодшыя дзеці гуляюць у гульню «Лавіць куры» разам, потым старэйшыя адпачываюць.

«КАЛЯДА»

Аднайменныя сюжэтна-вобразныя заняткі

Узрост: «Чамучкі» (старэйшыя), «Фантазёры».

Задачы: пашырыць веды дзяцей пра традыцыйна-абрадавае свята — Каляды; развіваць у іх кемлівасць, знаходлівасць, уменне пераўвасабляцца; выхоўваць пачуццё павагі да традыцыйных беларускіх святаў, пачуццё калектывізму.

Матэрыял: касцюм Каляды для дарослага.

Ход заняткаў

Дзеці ўваходзяць у спартыўную залу, якая мае выгляд вясковай хаты. Вядучы запрашае ўсіх да сябе ў госці.

Вядучы. Як добра, што вы да мяне завіталі! Пачынаю рыхтавацца да свята, і мне патрэбны памочнікі.

Выхавальнік. Адкажыце, калі ласка, а да якога ж свята вы рыхтуецеся?

Вядучы. Як, вы не ведаеце? Тады хутчэй сядайце на лаву і слухайце ўважліва.

Перад Новым годам да нас прыходзіць свята, якое мае назву Каляды. Гэта беларускае традыцыйна-абрадавае свята ладзіцца ў гонар Сонца. Для земляроба час з кастрычніка да снежня — перыяд замірання прыроды. Ён верыў, што ў гэты час уладарання сцюжы, холаду, мяцеліцы адбываецца барацьба дабра з ліхам, святла з цемраю. А з дня зімовага сонцапавароту — «адраджэння» Сонца — пачынаецца новы год, які абяцае прыход цяпла і святла, абуджэнне пладаноснай сілы зямлі.

Дарослыя гаварылі дзецям перад Калядамі: *«Дзеці, дзеці! Бачыце — сонейка нізка, Каляда блізка, хутка прыедзе на сівым кані».* Дзеці пыталіся: *«А дзе зараз Каляда?» — «Зусім блізка, за лесам»,* — адказвалі дарослыя.

На Каляды ладзяцца розныя забавы і гульні. І калі прыйдзе час, мы з вамі таксама вельмі весела сустрэнем гэтае свята. А зараз нам застаецца чакаць Каляду і рыхтаваць ёй падарункі.

Дзеці, адкажыце, калі ласка, якія падарункі мы можам падрыхтаваць Калядзе ў спартыўнай зале. *(Адказы дзяцей.)*

Я бачу, што кожны з вас хоча зрабіць вельмі цікавыя падарункі, але давайце, калі мы тут займаемся фізкультурай, будзем рыхтаваць «спартыўныя» падарункі. Кожны з вас ведае шмат рухаў, шмат практыкаванняў. Вось і падарыце іх Калядзе, але памятайце, што рухі паўтараць адзін за адным нельга.

А каб у нас усё атрымалася на свяце Каляды, трэба зараз правесці маленькую рэпетыцыю. Дапаможа нам у гэтым наш выхавальнік, які выступіць у ролі Каляды.

З'яўляецца пераапрануты ў абрадавы касцюм выхавальнік і прапануе дзецям пагуляць у беларускую народную гульню **«КАЛЯДА».**

«ДЗЕ ТЫ ХАДЗІЎ, КАЗЁЛ»

Сюжэтна-вобразныя заняткі

Узрост: «Чамучкі» (старэйшыя), «Фантазёры».

Задачы: прадоўжыць выхоўваць у дзяцей інтарэс да народных традыцый; садзейнічаць стварэнню добрага настрою; развіваць дыялагічнае маўленне дзяцей; выхоўваць спрыт, хуткасць рэакцыі на слова.

Матэрыял: адзенне для Каляды; малюнкі: зорка, пераапранутыя калядоўшчыкі; маска казла.

Ход заняткаў

Дзеці ўваходзяць у спартыўную залу, іх сустракае Каляда (пераапрануты выхавальнік).

Каляда. Рада вітаць вас, даражэнькія дзеці! Мне вельмі спадабалася ў вас гуляць, прымаць «спартыўныя» падарункі, таму я з вялікай радасцю вырашыла зноў завітаць да вас. Але прыйшла я не з пустымі рукамі, а прынесла новы аповед пра свята Каляды і новую беларускую народную гульню. Слухайце ўважліва.

Сімвалам Калядаў з'яўляецца зорка. Ад хаты да хаты хадзілі дзеці і падлеткі з каляднай зоркай і калядавалі. Зорка мае 5, 8 ці 16 промняў, якія заканчваюцца пампонамі з рознакаляровай паперы. *(Выхавальнік паказвае малюнкі.)* Хлопцы і дзяўчаты пераапранаюцца ў Казу, Каня, Дзеда, Мядзведзя, Ваўка і інш. У такіх масках і вывернутых кажухах яны ходзяць па хатах, віншуюць гаспадароў са святам, скачуць і спяваюць калядныя песні.

Адна з галоўных дзейных асоб — Каза. У старажытнасці яна шанавалася за здольнасці паляпшаць ураджай.

Дзе каза ходзіць — там жыта родзіць.
Дзе каза хвастом — там жыта кустом.
Дзе каза нагою — там жыта капною.
Дзе каза рогам — там жыта стогам.

У гэты час з'яўляецца вядучы ў масцы Казла.

Казёл. Добры дзень, дзеці! Вы мяне пазналі? Дзякуй вам за гэта. Я прыйшоў да вас пагуляць у калядную гульню «Казёл». Яна вельмі цікавая. Для гульні мне патрэбна шмат дзяцей і дзед.

Каляда. Табе, Казёл, пашанцавала, у нас ёсць дзеці, і ім вельмі падабаецца гуляць у беларускія народныя гульні. А вось дзеда мы зараз вызначым самі па лічылцы, але ты, калі ласка, не падглядвай *(у гэтай гульні Казёл не павінен ведаць, хто з дзяцей будзе абраны на ролю дзеда).*

Дзеці знаёмяцца з ходам гульні. У першы раз словы дзяцей прагаворвае Каляда (3—4 разы).

«У ГАСЦЯХ У КАЛЯДЫ»

Сюжэтна-гульнёвыя заняткі

Узрост: «Фантазёры».

Задачы: прадоўжыць знаёміць дзяцей з традыцыйным беларускім святам Каляды, заахвоціць да непасрэднага ўдзелу ў ім; садзейнічаць павышэнню рухальнай актыўнасці дашкольнікаў; развіваць моўную актыўнасць дзяцей, уменні суадносіць свае дзеянні са словамі, хутка і адэкватна рэагаваць на слоўны сігнал; выхоўваць вытрымку, смеласць, пачуццё калектывізму.

Матэрыял: абсталяванне для «вясковай хаткі»; маскі мядзведзя, жураўля, казла; бубен для музыкі; шапка для важака і кій.

Ход заняткаў

У групе дзеці рыхтуюцца ісці на гурток «Іванка і Надзейка». Да іх прыходзіць Каляда.

Каляда. Добры дзень у хату, добрыя людзі! Вы мяне пазналі? Дзякуй! Як і абяцала, з задавальненнем прыйшла да вас у госці. Мне вельмі цікава паглядзець, як вы тут жывяце. *(Звяртае ўвагу на афармленне групы ў беларускім стылі, на акуратна складзеныя цацкі і г.д.)* У вас вельмі прыгожая «хатка». А зараз дазвольце мне запрасіць вас да сябе ў госці.

Дзеці разам з Калядой ідуць у спартыўную залу, дзе для іх «пабудавана» вясковая хатка. На адной лаўцы пакладзены маскі казы, мядзведзя, жураўля; на другой — берасцяная торбачка, пакрытая ручніком.

Каляда. Праходзьце, дзеці, калі ласка, да мяне ў госці. Вось тут я жыву. Ці падабаецца вам мая хата?

Дзеці. Так!

Каляда. Дзякуй! Адпачніце каля такіх прыгожых *(называе і паказвае)* фіраначак, посцілак, абрусаў. І як тут не расказаць вам што-небудзь цікавае! Сёння я зноў нешта для вас падрыхтавала. Паглядзіце, што ляжыць на гэтай лаўцы? Правільна, гэта маскі. Адна з іх вам знаёмая, гэта маска казы. Давайце зараз успомнім, што вы ведаеце пра калядоўшчыкаў, пра іх адзенне, якую ведаеце гульню пра казу. *(Адказы дзяцей.)*

Малайцы, дзеці, мне вельмі радасна, што вы так многа ведаеце пра свята Каляды. Але вось тут на лаўцы ляжаць яшчэ маскі. Вось гэта маска мядзведзя. Звычайна на Каляды вадзілі мядзведзя. Ён сімвалізуе адвагу, дае здароўе ў хаце малым і старым, а мужчынам — сілу.

Вадзіў мядзведзя павадыр з доўгім кіем і музыка з бубнам. Ён прымушаў мядзведзя рабіць розныя дзеянні.

Паглядзіце, калі ласка, на маску мядзведзя, нешта ў яго вочкі сталі сумныя. Мабыць, ён хоча з намі пагуляць? А вы?

Дзеці. Так.

Каляда. Зараз я пазнаёмлю вас з беларускай народнай гульнёй **«МЯДЗВЕДЗЬ».**

У першы раз ролю важака выконвае Каляда, а ролю мядзведзя — другі дарослы (2 разы).

Пасля гульні Каляда звяртае ўвагу дзяцей на маску жураўля.

Каляда. Журавель, дзеці, з'яўляецца на Каляды спадарожнікам мядзведзя. На высокай палцы рабілі птушыную галаву: да палкі прымацоўвалі шырокае футра ці ўзятую ў зборкі прасціну.

Паглядзіце, журавель таксама хоча з намі пагуляць. Давайце зараз падзелімся на пары (дзяўчынка і хлопец) і пагуляем у беларускую народную гульню **«ЖУРАВЕЛЬ».**

Гульня паўтараецца 2—3 разы.

Дарослы. Дзякуй табе, Каляда, мы з дзецьмі цяпер ведаем пра свята Каляды і новыя абрадавыя гульні.

Каляда. Не-не, гэта яшчэ не ўсё. Звярніце, калі ласка, увагу на маю берасцяную торбачку. Яна завецца вярэнька. Вось у такую вярэньку калядоўшчыкі збіралі пачастункі, што давалі ім у хатах за песні, жарты і добрыя пажаданні.

Не даць пачастункаў за віншаванне ў калядную ноч — гэта значыла наклікаць бяду на сябе і свой дом. Таму, калі да вас прыйдуць калядоўшчыкі, вы абавязкова іх добра сустрэньце і пачастуйце. Тады, будзем спадзявацца, цэлы год у нашых хатах будуць згода, лад, сытны стол і добрае здароўе. А зараз я хачу вас усіх пачаставаць.

Каляда частуе дзяцей, а потым развітваецца.

«КОШКА І МЫШКА»

Гульнёва-творчыя заняткі

Узрост: «Чамучкі» (старэйшыя), «Фантазёры».

Задачы: пазнаёміць дзяцей з беларускай народнай гульнёй «Кошка і мышка» і выкарыстаць адпаведныя загадкі; удасканальваць беларускае маўленне дзяцей; развіваць уменне арыентавацца ў навакольным асяродку, трэніраваць рэакцыю на хуткасць, увагу; выхоўваць смеласць і пачуццё калектывізму.

Матэрыял: стол, вялікая кніга з малюнкамі і загадкамі, цацкі (кот і мыш, маска ката).

Ход заняткаў

Дзеці ўваходзяць у спартыўную залу. Пасярэдзіне стаіць стол, на ім ляжыць кніга.

Вядучы. Вось дык загадка! Мы прыйшлі ў спартыўную залу, каб пагуляць, павесяліцца, а нам нехта прапануе кнігу чытаць. Але нічога не зробіш, давайце разгледзім гэту кнігу. *(Бярэ яе ў рукі і паказвае вокладку.)* Дзеці, паглядзіце, якая цікавая вокладка ў гэтай кнігі! Яна нам усміхаецца *(дэманструецца малюнак з усмешкай)*, але на ёй няма ніводнай літары, мы не ведаем, пра што гэта кніга. А вам цікава даведацца, што на яе старонках? Ну, тады давайце яе разгорнем *(перагортвае старонкі кнігі)*. О, колькі тут рознакаляровых літар! Можа, вы ведаеце некаторыя з іх і якога яны колеру? *(Наладжвае гутарку з дзецьмі.)*

Дзеці, а зараз я вам прачытаю першую старонку і вы даведаецеся, пра што ідзе гаворка. *(Чытае: «Загадка»)*.

Дык вось у чым справа! Нам з вамі спачатку трэба разгадаць загадку або некалькі і толькі потым можна пачынаць гуляць. Слухайце ўважліва: пра каго ідзе гаворка ў першай загадцы?

Каціўся клубочак,
За клубочкам — торбачка,
За торбачкай — нітачка. ***(Пра ката.)***

Малайцы, дзеці, а вось вам другая загадка:

Лёг вусаты,
А ўстаў гарбаты. ***(Кот.)***

І зноў вы адгадалі. А вось мне цікава, хто з дзяцей можа паказаць другую загадку?

Дзеці лажацца на падлогу, потым прыпадымаюцца, прагнуўшы спіну, як кот.

Выхавальнік. Дзеці, мне так цікава! І я хачу пазнаёміць вас з другой старонкай нашай кнігі. Можна? *(Чытае:* «Загадка».) Вось зноў загадка. Слухайце ўважліва:

Маленькі шарык пад лаўкаю шарыць. ***(Мыш.)***

Вядучы. Вось мы і пазнаёміліся з кнігай. Цікава вам было? А зараз будзе яшчэ цікавей. Вам, маім кацяняткам, трэба знайсці «той маленькі шарык, што пад лаўкаю шарыць». Хто яго знойдзе, той і будзе ў нас галоўным катом.

Дзеці шукаюць цацку мышку. Пасля таго як дзіця знойдзе мыш, вядучы прапануе ўсім дзецям стаць вакол галоўнага ката. Па лічылцы або па жаданні самога ката выбіраецца мышка. Вядучы знаёміць дзяцей з беларускай народнай гульнёй **«КОШКА І МЫШКА»** *і наладжвае з імі гульню.*

Вядучы. Вось мы з вамі і пазнаёміліся з новай беларускай народнай гульнёй «Кошка і мышка». Спадабалася яна вам? А мне спадабаліся вы, бо ўсе былі вясёлыя, спрытныя, кемлівыя.

Выхавальнік. Дзеці, на гэтым наша вяселле не закончылася. Вас у групе таксама чакае сюрпрыз, пойдзем і паглядзім.

У групе дзяцей чакае сапраўдны кот, якога прынёс выхавальнік ці хто-небудзь з бацькоў. Дзеці разглядаюць яго.

«НАДЗЕЙКА І ЯЕ СЯБРЫ»

Фізкультурная забава

Узрост: «Чамучкі» (старэйшыя), «Фантазёры».

Задачы: пазнаёміць дзяцей з беларускай народнай гульнёй «Прэла-гарэла»; актывізаваць слоўнікавы запас дзяцей; развіваць хуткасць рэакцыі, кемлівасць, спрыт, уменне дзейнічаць па сігнале; выхоўваць цікавасць да народных гульняў, пачуццё калектывізму.

Матэрыял: некалькі невялічкіх цацак.

Ход заняткаў

Дзеці ўваходзяць у залу, садзяцца на лаўкі. Выхавальнік запрашае ўважліва яго паслухаць. У гэты момант з другой залы чуецца нечы голас: «Ку-ку, ку-ку, ку-ку».

Вядучы. Дзеці, вы чуеце? Мабыць, да нас заляцела птушачка?! Хто з вас ведае, якая птушка так падае голас? *(Уважліва выслухоўвае і каментуе адказы дзяцей.)* Давайце ўсе разам, але толькі вельмі ціха, каб не спужаць, пойдзем і паглядзім на гэту птушку.

Дзеці праходзяць у другую залу, але там нікога не бачаць. Праз хвілінку за спартыўным абсталяваннем зноў чуецца голас птушкі.

Вядучы. Ой, бедная птушка, напэўна, яна была параненая, заляцела да нас у вакенца. Давайце мы яе пашукаем, а калі трэба, і дапаможам ёй.

Дзеці падыходзяць бліжэй і ў гэты момант чуюць другі голас, які гаворыць: «Мяў, мяў, мяў...»

Вядучы. Нічога не разумею! Хто там у нас хаваецца? Ці гэта птушка, ці гэта кот, ці яны там удваіх? Трэба ціхенька паглядзець.

Зноў чуецца голас, але ўжо іншы: «Гаў, гаў, гаў...»

Вядучы. Здаецца мне, што там яшчэ і сабака хаваецца! Нешта тут не тое, бо птушка, кот і сабака дружна жывуць, сябруюць толькі ў казках.

Вядучы падыходзіць бліжэй да чароўнага месца і адтуль зноў чуюцца галасы розных жывёл (гусака, пеўня, мядзведзя).

І тут з патаемнага месца да дзяцей з'яўляецца Надзейка (пераапрануты ў беларускі народны касцюм выхавальнік).

Надзейка. Добры дзень, дзеткі! Што гэта з вашымі вочкамі зрабілася? Бачу ў іх поўнае непаразуменне. Напэўна, вы чакалі тут сустрэць цэлую кампанію жывёл? *(Адказы дзяцей.)*

Я думаю, што вам было б цікава ўбачыцца з маімі сябрамі, і магу вам у гэтым дапамагчы. Зараз разам са мной вы павінны сказаць некалькі разоў чароўныя словы (з гульні «Прэла-гарэла») і тады адбудуцца цуды.

Дзеці знаёмяцца з гульнёй **«Прэла-гарэла».**

Надзейка. Малайцы, дзеці! Усе вельмі стараліся, знайшлі ўсіх маіх сяброў. Такім чынам, мы пазнаёміліся яшчэ з адной беларускай народнай гульнёй пад назвай «Прэла-гарэла». А зараз давайце возьмем усе нашы цацкі і пагуляем з імі ў беларускія народныя гульні, якія вы ўжо ведаеце.

Дзеці наладжваюць гульні: **«У КАТА», «У МЯДЗВЕДЗЯ НА БАРУ», «У ГУСІ»,** *потым развітваюцца з цацкамі і Надзейкай.*

«У КРАІНУ ГУЛЬНЯЎ СА СНЯГУРКАЙ»

Фізкультурная забава

Узрост: «Чамучкі» (старэйшыя), «Фантазёры».

Задачы: пазнаёміць дзяцей з беларускай народнай гульнёй «Замарожаныя» і адначасова праз гульню выхоўваць павагу і цікавасць да нацыянальных традыцый, садзейнічаць развіццю правільнага беларускага вымаўлення; удасканальваць навыкі бегу з улікам змены тэмпу і напрамку; выхоўваць смеласць, сумленнасць.

Матэрыял: «казачная» хатка, касцюм Снягуркі (на дарослага), мяккія вялікія цацкі (мядзведзь, заяц, ліска).

Папярэдняя работа: перад выхадам на вуліцу выхавальнік павінен правесці з дзецьмі гутарку на тэму «Зімовыя з'явы ў прыродзе», звярнуць увагу на надвор'е ў гэты дзень (абавязкова — на мароз).

Ход заняткаў

Заняткі праводзяцца на спартыўнай пляцоўцы дзіцячага сада.

Дзеці прыходзяць на спартыўную пляцоўку, пасярэдзіне якой стаіць «казачная» хатка. Вядучы падводзіць да яе дзяцей, і яны стукаюцца ў вакенца. З хаткі вітае іх Снягурка.

Снягурка. Добры дзень, дзеці! Як я рада вас усіх бачыць! Мне так сумна было сядзець адной у гэтай хатке! Ніяк не магу здагадацца, куды ўсе падзеліся, на вуліцы нікога няма. У мяне шмат сяброў — лясных звяроў, але і іх нідзе не відаць. Што такое здарылася, чаму ўсе акрамя вас пахаваліся?

Вядучы. На вуліцы сёння трашчыць мароз, мабыць, усе твае сябры, Снягурка, пахаваліся недзе. А вось нас не палохае такое надвор'е, бо мы любім свежае паветра, гульні на вуліцы.

Не смуткуй, Снягурка! Нашы дзеці добрыя, вясёлыя, яны развесяляць цябе і дапамогуць знайсці тваіх сяброў.

Снягурка. Вялікі вам дзякуй, дзеткі, за вашу дабрыню! Перад тым як нам адправіцца ў доўгі шлях шукаць маіх сяброў, вам трэба зрабіць добрую размінку, і дапаможа нам у гэтым сённяшні мароз. Хто з вас хоча быць замарожаным і застацца на гэтай пляцоўцы? *(Чакае адказу дзяцей.)* А калі ўсе дзеці жадаюць адправіцца ў пошукі маіх сяброў, то трэба быць лоўкімі, трывалымі, хуткімі. Зараз мы паглядзім, хто з вас сябруе з фізкультурай.

Спачатку зрабіце вялікае кола, а я знайду сабе памочніка-мароза па лічылцы (з гульні).

Дзеці знаёмяцца з правіламі гульні і гуляюць некалькі разоў.

Снягурка. Вось мы з вамі і пазнаёміліся з беларускай народнай гульнёй **«ЗАМАРОЖАНЫЯ»,** зрабілі добрую размінку і зараз адправімся шукаць маіх сяброў.

Дзеці рухаюцца да сваёй пляцоўкі, па дарозе знаходзяць мяккія вялікія цацкі (мядзведзь, заяц, ліска) і гуляюць у беларускія народныя гульні **«МЯДЗВЕДЗЬ», «ЗАІНЬКА»,** *забаўлянку* **«ХОДЗІЦЬ ЛІСКА ЛЯ ВАКОНЦА».** *Пасля гульняў развітваюцца з цацкамі і Снягуркай.*

«МАЛЯВАНЫЧ І КАЛЯРОВЫ ПЕВЕНЬ»

Сюжэтна-вобразныя заняткі

Узрост: «Фантазёры».

Задачы: пазнаёміць дзяцей з беларускай народнай гульнёй «Фарбы» з выкарыстаннем элементаў малявання і матэрыялаў апавядання «Каляровы певень»; практыкаваць ва ўменні бегаць з лоўляй і ўхіленнем; развіваць кемлівасць, памяць, спрыт; выхоўваць вытрымку, хуткасць рэакцыі, сумленнасць.

Матэрыял: мальберт з лістом паперы; фарбы (чырвоная, сіняя, зялёная, жоўтая); слоік з вадой, пэндзаль, «фарбы» з картона на кожнага ўдзельніка; адзенне для Несцеркі; кніга «Чытанка для дзіцячага сада» з апавяданнем «Каляровы певень» В. Суцеева.

Ход заняткаў

Дзеці ўваходзяць у фізкультурную залу. Пасярэдзіне яе стаяць мальберт з чыстай паперай, стол, на якім знаходзяцца слоік з вадой, фарбы, пэндзаль, кніга. Вядучы звяртае ўвагу дзяцей на ўсё абсталяванне.

Вядучы. Дзеці, нешта я нічога не разумею. Адкуль гэта ўсё ўзялося і што нам з гэтым рабіць? Ці поўзаць пад гэтым мальбертам, сталом, ці аднесці куды?

У зале з'яўляецца Маляваныч (пераапрануты выхавальнік).

Маляваныч *(заходзіць вельмі хутка).* Пачакайце, пачакайце! Нічога не трэба адносіць. Гэта ўсё маё! Я хачу з вамі падзяліцца адной гісторыяй, але спачатку павітаемся і пазнаёмімся з вамі. Добры дзень, дзеці! *(Усе вітаюцца.)* Маё імя Маляваныч, я вельмі люблю маляваць. А як завуць вас? *(Падыходзіць да кожнага дзіцяці і знаёміцца.)*

Дзеці, вось у гэтай кніжцы я запісаў сваю цікавую гісторыю. Яе вам няхай прачытае вядучы, а я гэту гісторыю намалюю.

Вядучы чытае апавяданне «Каляровы певень», Маляваныч малюе пеўніка, як гаворыцца ў апавяданні.

Вядучы *(чытае апавяданне).* Намаляваў Уладзя пеўня, а вось расфарбаваць яго забыўся. Пайшоў певень гуляць.

— Што ты ходзіш такі нерасфарбаваны? — здзівіўся сабака.

Паглядзеў певень у ваду. І сапраўды. Сабака слушна кажа:

— Не журыся, — сказаў сабака, — ідзі да фарбаў: яны табе дапамогуць.

Прыйшоў певень да фарбаў і просіць:

— Фарбы, фарбы, дапамажыце мне!

— Добра, — сказала чырвоная фарба і расфарбавала яму грабеньчык і бародку.

А сіняя фарба — пёркі на хвасце.

Зялёная — крылцы.

А жоўтая — грудку.

— Вось цяпер ты сапраўдны певень! — сказаў сабака.

Вядучы. Вялікі дзякуй табе, Маляваныч! Нам з дзецьмі было цікава даведацца пра гісторыю і паглядзець на твой прыгожы малюнак.

Маляваныч. Але гэта яшчэ не ўсё. У мяне ёсць і «казачныя фарбы». Зараз я іх вам пакажу і на стол пакладу. Потым кожны з вас пойдзе да стала і возьме тую фарбу, якая вам больш падабаецца. Такім чынам вы ўсе ператворыцеся ў фарбы. А хто прыйдзе іх купіць, вы зараз даведаецеся.

Вядучы знаёміць дзяцей з гульнёй **«ФАРБЫ»,** *і яны гуляюць у яе.*

Па заканчэнні гульні Маляваныч прапануе дзецям паказаць свае фарбы і назваць іх колер.

Вядучы выказвае падзяку Маляванычу за займальную гісторыю, за малюнак, за цікавую гульню з фарбамі.

«ГАРЛАЧЫК»

Спартыўна-тэатралізаваная казка

Узрост: «Фантазёры».

Задачы: пазнаёміць дзяцей з беларускай народнай гульнёй «Гарлачык» на матэрыяле казкі «Церамок»; вучыць часткова ўзнаўляць тэкст, садзейнічаць развіццю ўвагі, уяўлення; практыкаваць ва ўменнях хутка бегаць, дзейнічаць па сігнале, хутка арыентавацца ў навакольным асяродку; выхоўваць сяброўскія адносіны.

Абсталяванне: шырма, адзенне для бабулі-казачніцы, гарлачык, медальёны на кожнае дзіця з малюнкам гарлачыка, доўгая вяроўка, дошка, цацкі (муха, камар, мышка, жабка, заяц, ліса, мядзведзь).

Ход заняткаў

Дзеці ўваходзяць у фізкультурную залу. На падлозе ляжыць фізкультурнае абсталяванне («паласа перашкод»), збоку знаходзіцца шырма (казачны дом — «беларуская хатка»), упрыгожаная ў беларускім стылі.

Вядучы звяртае ўвагу дзяцей на «казачную» залу.

Вядучы. Дзеці, паглядзіце, як цікава сёння ў нашай фізкультурнай зале, нібы мы апынуліся ў нейкай казцы.

Бачыце, стаіць беларуская хатка. Так і хочацца даведацца, хто ў ёй жыве. Але каб нам трапіць да хаткі, трэба прайсці па чароўнай дарожцы.

Дзеці праходзяць «паласу перашкод»: ідуць па дошцы, падлазяць пад доўгай вяроўкай, якая нацягнута каля хаткі, і садзяцца на гімнастычную лаву.

Вядучы. Дзеці, паглядзіце на прыгожы званок, які вісіць каля вакенца. Трэба ў яго пазваніць, і мы даведаемся, хто там жыве.

Вядучы звоніць. З хаткі даносіцца голас: «Зараз, зараз. Пачакайце хвілінку». Адчыняецца акенца, і перад дзецьмі з'яўляецца бабуля-казачніца (пераапрануты выхавальнік).

Бабуля. І хто гэта да мяне прыйшоў? *(Гэта мы, дзеці.)* Я вельмі рада такім гасцям. Давайце з вамі пазнаёмімся. Я — бабуля-казачніца. А як вашы імёны? *(Дзеці па чарзе называюць свае імёны.)* Вось мы і пазнаёміліся. А зараз я дастану сваю чароўную палачку, і мы з вамі трапім у вельмі цікавую казку. Вы зможаце паслухаць, паглядзець, а таксама стаць актыўнымі ўдзельнікамі ў маёй казцы. А называецца яна «Церамок».

Бабуля-казачніца з дапамогай вядучага расказвае казку і паказвае лялечны тэатр. На працягу казкі з дапамогай чароўнай палачкі дзецям прапануецца ператварыцца ў пэўнага казачнага героя і паказаць яго рухі.

Ехаў дзядзька на кірмаш.
Вёз гарлачыкі, жбанкі —
Іх размалявалі мастакі.
Калі ехаў праз лясок,
Зваліўся гарлачык пад кусток —
Велізарнейшы, гліняны,
Нібы сонцам паліваны.

Прыляцела адразу ж муха,
Загудзела папаўзуха:
— Чый жа гэта церамок у траве,
Хто, хто, хто ў ім жыве?
Не адчуўшы адказу,
У гаршчок палезла зразу,
Стала муха жыць у ім,
Светлым церамі сваім.
Падаспеў якраз камар,
Зазвінеў насач-званар:
— Чый жа гэта церамок у траве,
Хто, хто, хто ў ім жыве, жыве?
(Гавораць.)
— Я, муха-папаўзуха, а ты хто?
— Я, камар, удалы званар!

— Дык заходзь, што гаварыць.
Будзем дружна разам жыць.
І жывуць яны ўдваіх,
Лад, парадак, згода ў іх.

Знекуль мышка-паскрабуха
Падышла, тапырыць вуха:
— Чый жа гэта церамок у траве,
Хто, хто, хто ў ім жыве, жыве?
(Гавораць.)
— Я, муха-папаўзуха.
— Я, камар-званар.
А ты хто?
— Я, мышка-паскрабуха!

— Дык заходзь, што гаварыць.
Будзем дружна разам жыць.
І жывуць яны ўтраіх,
Лад, парадак, згода ў іх.

Жабка раптам прыскакала
І ласкава запытала:
— Чый жа гэта церамок у траве,
Хто, хто, хто ў ім жыве, жыве?
(Гавораць.)
— Я, муха-папаўзуха.
— Я, камар-званар.
— Я, мышка-паскрабуха,
А ты хто?
— Я, жабка-квакуха!

— Дык заходзь, што гаварыць.
Будзем дружна разам жыць.
І жывуць яны ўчацвярых,
Лад, парадак, згода ў іх.

Зай прыбег і ўсё пытаў,
У вакенца заглядаў:
— Чый жа гэта церамок у траве,
Хто, хто, хто ў ім жыве, жыве?
(Гавораць.)
— Я, муха-папаўзуха.
— Я, камар-званар.
— Я, мышка-паскрабуха,
— Я, жабка-квакуха!
А ты хто?
— Я, зайчык-зай, уцякайчык-уцякай!

— Дык заходзь, што гаварыць.
Будзем дружна разам жыць.
І жывуць яны ўпяцярых,
Лад, парадак, згода ў іх.

Напаткала дом лісіца
Рыжахвостая хітрыца:
— Чый жа гэта церамок у траве,
Хто, хто, хто ў ім жыве, жыве?
(Гавораць.)
— Я, муха-папаўзуха.
— Я, камар-званар.
— Я, мышка-паскрабуха,
— Я, жабка-квакуха,
— Я, зай-уцякай!
А ты хто?
— Ды я, ліса — лясоў усіх краса.

— Дык заходзь, што гаварыць.
Будзем дружна разам жыць.
І жывуць яны ўшасцярых,
Лад, парадак, згода ў іх.

Буры мішка касалапы
Загрымеў у дзверы лапай:
— Чый жа гэты церамок?
— Я, муха-папаўзуха.
— Я, камар-званар.
— Я, мышка-паскрабуха,
— Я, жабка-квакуха,
— Я, зай-уцякай,
— Я, ліса — лясоў краса!
А ты хто?
— Я, мядзведзь, не знаю, дзе сілу дзець.

І як сеў на церамок —
разламаў увесь дамок.
Каб жа ў мішкі розум быў,
ён і сам бы ў доме жыў.

Бабуля. Вось і казка закончылася, а хто слухаў, зразумеў яе, той малайчына.

Вядучы. Вялікі дзякуй табе, бабуля-казачніца, за казку, яна нам вельмі спадабалася. Прыходзь да нас часцей і знаёмь з новымі казкамі. А пакуль да пабачэння!

(Вядучы праводзіць невялікую гутарку па змесце казкі.)

Дзеці, давайце разам успомнім, што згубіў дзядзька, які ехаў на кірмаш? *(Гарлачык.)*

Што далей адбылося з гарлачыкам? *(Ён стаў церамком для мухі-папаўзухі, камара-званара, мышкі-паскрабухі, жабкі-квакухі, зая-ўцякая, лісы — лясоў усіх красы. А мядзведзь быў вялікі і развалій гарлачык.)*

Дзеці, як мне шкада гэты гарлачык, каб вы толькі ведалі! Што ж рабіць? Як дапамагчы гарлачыку?

Выхавальнік. Я ведаю! Я мастак, які размаляваў казачны гарлачык. А зараз паспрабую з маленькіх кавалачкаў гліны стварыць некалькі новых гарлачыкаў.

Выхавальнік-мастак пачынае «працаваць» і надзявае на кожнае дзіця медальён з малюнкам гарлачыка.

Вядучы. Як цудоўна! Вось колькі многа гарлачыкаў зрабіў мастак! Дзякуй табе! Ну, а зараз можна і на кірмаш адпраўляцца, гарлачыкі прадаваць.

Вядучы і выхавальнік бяруць кожны «гарлачык» (дзіця) і ставяць яго на продаж (садзяць дзяцей на кукішкі па крузе). Пачынаецца знаёмства з беларускай народнай гульнёй **«ГАРЛАЧЫК».**

Вядучы *(па заканчэнні гульні).* Надышоў час зачыняць наш кірмаш.

Выхавальнік. А гарлачыкі, якія яшчэ не прадаліся, я палажу ў мяшэчак і аднясу дахаты. Няхай пабудуць у мяне да наступнага кірмашу.

Дзецям прапануецца залезці ў вялікія мяшкі і прапаўзці ў іх разам да выхаду (або выхавальнік пакрывае дзяцей вялікім кавалкам палатна, і яны на кукішках ідуць да выхаду).

Ядвига ШАБАЛА,
начальник отдела игры и игрушки управления дошкольного образования, игры и игрушки Методического центра НМУ «Национальный институт образования», учитель-дефектолог высшей категории

Заикание: ИГРАЕМ, ПОЗНАЁМ ОКРУЖАЮЩИЙ МИР, ГОВОРИМ ПРАВИЛЬНО

Статья 4. ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ИГРОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В КОРРЕКЦИИ ЗАИКАНИЯ У ДЕТЕЙ

(Продолжение. Начало в № 4, 9, 10 за 2010 год.)

ЗАИКАНИЕ — это дискоординационное расстройство речи. Внешне оно проявляется в судорожных нарушениях речевого ритма, связанных с предшествующими и одновременными болезненными неврологическими и психическими изменениями, особенно в эмоционально-волевой сфере.

Заикание у детей тесно связано с формирующейся личностью ребёнка, и поэтому его следует рассматривать в структуре особенностей и деятельности этой личности.

Уже в дошкольном возрасте, в отдельных реакциях и поступках детей заметна сложная борьба личных стремлений, желаний, интересов и потребностей с требованиями общества.

Заикающиеся дети в своём поведении руководствуются не только своими личными желаниями, интересами, потребностями взрослых и детей, требованиями окружающих, но и ограниченными возможностями общения вследствие имеющегося у них речевого нарушения. У одних детей общественные отношения нарушены из-за развившегося заикания, у других эти отношения вообще не сформировались.

У заикающихся детей имеются отклонения их общего развития, развития речи, моторики, подражательности, самостоятельности, сформированности взаимоотношений. Поэтому при перевоспитании личности заикающегося, при формировании его поведенческой и речевой активности следует учитывать как общее состояние ребёнка, так и речевые нарушения. Этим требованиям как раз и отвечает использование игровой деятельности в коррекции заикания у детей.

ИГРА — ведущая деятельность детей дошкольного возраста. В ней происходит развитие личности ребёнка, его речи, мышления, произвольной памяти, самостоятельности, моторики, формируется умение управлять своим поведением. В игре дети накапливают и социальный опыт межличностных отношений, усваивают нормы общения между людьми, которые определяют характер общественного поведения.

Игровая деятельность может быть использована и как средство воспитания заикающихся детей, для коррекции их речи и одновременно личностных отклонений. Любая игра есть деятельность, поэтому систему игр можно рассматривать как совокупность разных деятельностей, связанных между собой. Такое понимание игры очень важно, так как позволит педагогу не путать её с игровым упражнением. Ведь нередко игрой называют и упражнения с мячом, с флажком, и проговаривание рифмованного текста, и пр. Игра же как деятельность всегда предполагает сговор на игру, выбор водящего, распределение ролей, развитие, завершение и оценку исполнения роли каждым играющим.

При использовании в работе с заикающимися детьми системы игр воспитателю необходимо иметь в виду:

- возраст детей;
- их психофизические особенности (развитие моторики, степень подражательности, общительности, отношение к коллективу играющих сверстников, активность, самостоятельность, а также возбудимость, заторможенность, замкнутость, негативизм, нервность, истощаемость);
- проявления заикания (форма и вид судорог, степень их выраженности);
- воспитываемый вид речи (сопряжённая, отражённая, вопросно-ответная, самостоятельная);
- микросоциальное окружение (учитывается фактор речевого окружения и наилучшие возможности организации игр в детском саду и дома);
- особенности игровой деятельности хорошо говорящих детей;
- дидактические принципы (доступность речевого материала, последовательность в подаче игр, ведущая роль учителя-дефектолога и др.).

Все игры проводятся с последующим усложнением сюжетов, речевого материала и методики проведения. Кроме того, нужно постепенно осуществлять переход от игр с готовым содержанием к играм, формирующим активное поведение детей и свободу общения со сверстниками.

Для развития всех видов речи заикающихся детей 3—5 лет первостепенное значение имеют игры с пением (хороводы с плясовыми движениями), которые проводятся почти на каждом занятии. В этих играх от детей не требуется сразу же большая активность, поэтому они позволяют замкнутым и нерешительным ребятам привыкнуть к учителю-дефектологу, воспитателю, к товарищам. И наоборот, несдержанность поведения, двигательное беспокойство излишне подвижных детей тормозятся общим спокойным характером игры. Ребята стараются не торопиться, ждут своих более медлительных товарищей по игре.

Дальнейшее закрепление активного поведения и речи заикающихся детей проходит в процессе подвижных игр, которые по своей значимости стоят на втором месте. Подвижные игры в педагогике делятся на игры большой, средней и малой подвижности (М.М. Конторович, Л.М. Михайлова). В работе с заикающимися детьми используются главным образом игры двух последних видов, так как игры большой подвижности нарушают темп дыхания, который у заикающихся детей не в норме.

В подвижных играх дети с удовольствием двигаются, говорят в такт движениям. Однако надо помнить, что игры в мяч с трудом удаются детям 3—5 лет, поэтому лучше использовать ленты и флажки. Подвижные игры помогают готовить детей к овладению самостоятельной речью. Ясно и чётко объяснив правила игры, учитель-дефектолог (воспитатель) назначает ведущего и вместе с ним говорит

текст. Меняя ведущих, учитель-дефектолог (воспитатель) проговаривает слова со всеми. При отражённой речи ребёнок, начав говорить за взрослым, заканчивает фразу самостоятельно.

ПОДВИЖНЫЕ ИГРЫ нормализуют моторику заикающихся детей: в ходе игры им приходится реагировать на одни сигналы и удерживаться от движений при других, сочетать движения с ритмом речи. Но эти игры резко усиливают игровую активность, и учителю-дефектологу (воспитателю) приходится особенно внимательно следить за поведением излишне подвижных детей.

Дидактические игры, несущие в себе скрытую цель — научить детей свободному общению, особенно полезны для детей с общим недоразвитием речи. Обычно, прежде чем устранять заикание, учитель-дефектолог проводит работу по коррекции звукопроизношения, так как иногда с исправлением неправильного произношения исчезает и заикание. Но если заикание уже повлияло на поведение ребёнка, косноязычие и заикание исправляются параллельно. Игры на звукоподражание, с разборными игрушками, лото, домино, на определённый звук нормализуют произношение, а спокойная манера их проведения положительно влияет на поведение детей. Чёткие и определённые правила в дидактических играх помогают преодолевать речевые стереотипы детей, учат точно выражать свои мысли и очищают их речь от ненужных слов (эмболофразий).

Дидактические игры со строго упорядоченными действиями ставят всех детей в равное положение, что способствует воспитанию у них выдержки, дисциплинированности, собранности, внимания, чуткого отношения к товарищам. В то же время дидактические игры, приближаясь по своему содержанию и способу проведения к занятиям, не несут эмоционального заряда, нужного для активизации поведения заикающихся детей 3—5 лет.

Вслед за дидактическими играми по степени значимости следуют игры-драматизации стихотворений, прозы, игры в настольный театр и творческие игры (вначале по предложению взрослого, затем по замыслу самих детей).

В работе с заикающимися детьми 5—6 лет ведущее место занимают игры-драматизации стихотворного текста. Учитель-дефектолог подбирает тексты, имеющие воспитательную ценность, насыщенные глагольной лексикой, с чёткой логической последовательностью изложения, художественной выразительностью языка, с простым построением фраз.

Игры-драматизации готовят детей к развёрнутому, связному и последовательному изложению мыслей, развивают речь заикающихся детей (от облегчённых её форм до самостоятельной), учат их интонационной выразительности, развивают движения, воспитывают положительные нравственные качества, творческую самодеятельность, общительность, организаторские качества.

Не менее важны для данной возрастной группы и игры с пением. В период обучения сопряжённой речи дети поют и играют вместе с учителем-дефектологом (воспитателем); при отражённой — песню начинает взрослый, а дети повторяют припев и выполняют действия; при вопросно-ответной речи поёт ребёнок-водящий, а остальные отвечают ему хором или по одному. Если для детей 3—5 лет больше подходят игры хороводные, то для 5—6-летних — инсценировки с пением. Участвуя в них, ребята учатся общаться в коллективе сверстников, владеть собой и своим телом, а песенный речитатив облегчает им технику произношения.

Дидактические и подвижные игры с правилами также используются в работе с заикающимися детьми этого возраста.

Для заикающихся детей 5—6 лет на первый план выдвигаются дидактические (математические) игры, которые удовлетворяют потребности дошкольников в играх-занятиях. Наряду с этим всё большее развитие получают творческие игры, формирующие инициативу, организаторские навыки, активность, а также игры со школьной тематикой.

На втором месте стоят подвижные игры с правилами и с элементами соревнования. Эти игры воспитывают в детях выдержку, умение объективно оценивать результат игры и поведение товарищей.

Игры-драматизации стихотворного текста также воспитывают в детях умение находиться в коллективе сверстников. Выученный детьми словесный материал способствует свободе общения. Игры с пением занимают одно из последних мест в работе с детьми этого возраста, ребята неохотно участвуют в них.

Коррекционная работа по системе игр проводится в несколько этапов.

✓ На ***первом этапе*** учитель-дефектолог обследует состояние речи детей во время деятельности, изучает их поведение в играх и при выполнении режимных моментов, выявляет личностные особенности каждого (отношения со взрослыми и сверстниками, характер общительности, подражательности, активность, состояние моторики, отношение к своему заиканию и т.д.), осуществляет коррекцию дыхания, голоса, развитие динамики речевого аппарата, составляет индивидуальный и общий с воспитателем план работы.

✓ ***Второй этап*** — этап максимального ограничения речи. Его цель — затормозить у детей патологические рефлексы на неправильную речь, сопутствующие движения и действия, употребление лишних слов (ну, вот, и, а, так и т.д.). Этот этап включает период молчания (3—6 дней) и период шёпотной речи (10—12 дней, при необходимости с последующим повторением). За это время у заикающихся детей воспитываются внимание, усидчивость, подражательность, общая и ручная моторика.

Материалом занятий служат спокойные дидактические игры: настольные, со строительным материалом, разборными игрушками, куклами, мозаикой, игры на подражательность, а также малоподвижные игры, в процессе которых дети учатся соблюдать правила игры, выбирать водящего, распределять роли. Игры подбираются безречевые или с максимальным ограничением речи. Постепенно в них включаются шёпотная речь.

Игры-инсценировки носят условный характер: учитель-дефектолог говорит шёпотом текст, а дети, предварительно распределив с учителем-дефектологом роли, разыгрывают его. Затем учитель-дефектолог оценивает выполнение ролей детьми.

✓ На ***третьем этапе*** — облегчённых форм речи — у детей воспитывается мягкое голосоначало, слитность произношения, выразительность речи, длительность выдоха. Одновременно ведётся работа по воспитанию у заикающихся детей произвольного поведения. Они учатся подчиняться правилам и выполнять требования, исходящие не только от взрослого, но и от товарищей. На занятиях с детьми проводятся игры с пением (хороводные и инсценировки), дидактические игры с правилами средней подвижности, игры-драматизации стихотворного и прозаического текстов. Выбор водящего в играх осуществляется с помощью считалок, которые дети проговаривают вместе с учителем-дефектологом (или за ним). Говорящий обязательно сопровождает свои слова плавным движением руки от ребёнка к ребёнку. В дидактических и подвижных играх широко используются звукоподражания.

На данном этапе на занятиях вводятся элементы творческих игр по предложению учителя-дефектолога.

Материалом домашних заданий являются настольные дидактические, подвижные игры, сопряжённо-отражённое проговаривание детьми вместе с родителями потешек, стихотворений, отрывков сказок и т.д.

✓ На ***четвёртом этапе*** — вопросно-ответной речи — учитель-дефектолог продолжает работу по коррекции поведения и речи заикающихся детей. Подбор игр может быть самый различный: игры с пением, дидактические, подвижные с правилами, игры-драматизации, творческие. Обязательным условием является соблюдение во всех играх диалогической речи в вопросно-ответной форме. Вначале на вопрос учителя-дефектолога или водящего дети отвечают хором, затем индивидуально. От полного ответа ребята постепенно переходят к разговорной диалогической манере общения.

Речевая работа во время проведения разнообразных игр заключается в воспитании длительного выдоха, мягкого голосоначала, слитности фразы, выразительности речи. В этот период всё больший удельный вес приобретают игры-драматизации, настольный и кукольный театр, творческие игры, проводимые в форме диалога. И от учителя-дефектолога требуются большая выдумка, умение методически переработать или создать новую игру в соответствии с требованиями вопросно-ответной формы речи.

✓ Цель ***пятого этапа*** — воспитание самостоятельной речи. Учитель-дефектолог создаёт большое число игровых ситуаций, в которые органически включаются пересказы заранее подготовленного текста (монологи ведущих в кукольном и настольном театрах, монологи главных действующих лиц в творческих играх и т.д.), иногда обыгрываются и неподготовленные пересказы. Это воспитывает у детей творческую активность, будит фантазию, позволяет им привлекать знания из накопленного жизненного опыта. Этому же способствуют творческие игры в библиотеку, в книжный магазин, в почту, день рождения, стройку и т.д.

В сюжетные дидактические игры включаются такие виды работы, которые дают детям новые знания. В творческих играх, играх-драматизациях дети самостоятельно придумывают конец или начало к разыгрываемому диалогу, сказке или знакомой ситуации, сами изменяют и создают новые правила той или иной игры, сами предлагают игру, распределяют роли, рассказывают её правила, развивают и заканчивают. Так же самостоятельно ребята оценивают и поведение своих товарищей на занятии. При этом они учитывают, что нового внёс каждый ребёнок в игру, проявил ли выдумку и как исполнил свою роль. В играх этого этапа у детей наиболее ярко проявляется фантазия и творческая активность, формируется произвольное поведение.

Приводим примеры отдельных занятий по системе игр для воспитания поведения и речи заикающихся детей в начале курса занятий и в конце его.

ЗАНЯТИЕ ПО ВОСПИТАНИЮ ШЁПОТНОЙ РЕЧИ У ДЕТЕЙ 5—6 ЛЕТ

Цель: прививать речевые навыки; учить детей увеличивать выдох, овладевать мягким приступом выдоха, управлять мышцами артикуляционного аппарата, владеть мимикой, жестами; закреплять обобщающие понятия по теме «Овощи и фрукты»; воспитывать личностные качества: выдержку, внимание, подражательность.

Программное содержание: учитель-дефектолог шёпотом приветствует детей. Они отвечают ему так же.

Логоритмика (воспитание чувства ритма, координации движений, внимания). По команде учителя-дефектолога (команды даются шёпотом) под ритмичные и тихие удары бубна дети выполняют движение: ходьба на полной ступне, на носочках, остановка, изменение направления. *(Упражнения повторяются 1—3 раза.)*

Расслабляющие, дыхательные и артикуляторно-мимические упражнения: снятие напряжения мышц туловища, воспитание спокойного вдоха и длительного (в 5—7 секунд) выдоха, овладение мимикой.

Ход занятия

Учитель-дефектолог (У.-д.). Дети, вот полянка, а на ней растут цветы. Что-то давно не было дождя, и цветочки завяли. Сначала опустились головки, потом листики, а потом согнулся весь стебелёк до самой земли. Покажите, как завяли цветы. *(Упражнение проводится под счёт: на «раз» дети опускают головы, на «два» — роняют руки вдоль туловища, на «три» — приседают на корточки.)* Вдруг закапал дождик, и цветочки начали оживать. *(Упражнение повторяется в обратном порядке.)*

Когда дует сильный ветер, то верхушки деревьев качаются и шумят. Посмотрите, дети, как надо сделать, чтобы верхушки зашумели. *(Учитель-дефектолог демонстрирует спокойный вдох без поднятия плеч и длительный выдох с произнесением звука* **ш***.)* Подул ветерок *(дети поднимают руки над головой)*, зашумели деревья *(покачивая руками, дети произносят звук* **ш***)*, затих ветер *(дети спокойно опускают руки вниз)*.

Игра «ТОЛСТЯЧКИ И ХУДЫШКИ»

